Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 ЛІСТАПАДА 2016 г. ПЯТНІЦА № 228 (28338)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Тэхналогія рамонту дарог

СТАР. 2



Закулісся папулярнага тэлепраекта

СТАР. 5



Праграма тэлебачання на тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

*ЛІЧБА ДНЯ*

**Br722,9 склала**

*ў кастрычніку 2016 года налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі (у верасні — Br732,9), паведаміў Нацыянальны статыстычны камітэт. Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у кастрычніку бягучага года была роўная Br724,7 (у верасні — Br734,8).*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 4° |
| Віцебск | + 1° |
| Гомель | + 2° |
| Гродна | + 3° |
| Магілёў | + 1° |
| Мінск | + 1° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.11.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9647 | ▲ |
| Еўра | 2,0705 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0304 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0767 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ГАЮЧАЕ РАЗНАТРАЎЕ



Жыхар гарпасёлка Ушачы Аляксандр Крацёнак па адукацыі эканаміст, але ў яго сапраўды энцыклапедычныя веды пра лекавыя расліны — некалі працаваў дырэктарам нарыхтоўчай канторы Белкаапсаюза, якая ў год нарыхтоўвала па 12 тон гаючай сыравіны для аптэк. Улетку ён збірае зёлкавыя букеты, сушыць іх, робіць настойкі, а восенню і зімою на мясцовым кірмашы прадае запасы гаючага разнатраў'я. Слухаць павучальныя лекцыі Аляксандра Віктаравіча пра карысць зёлак — адно задавальненне! Якіх толькі раслін у ягонай духмянай калекцыі няма — мацярдушка і балігалоў, ваўчкі і парушэнец, дуброўка і канюшына, палын і сухацвет, верас і чабор, меліса і ліпа... Усім, хто цікавіцца, ён з ахвотай раскажа, ад якой немачы тая ці іншая расліна, як яе ўжываць. І абавязкова дадасць, што рабіць усё трэба з добрым настроем, тады і гаючая сіла зёлак мацнее.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

■ Жыллё маё

## НОВАЎВЯДЗЕННЕ НА ПЕРСПЕКТЫВУ

### Каля 2 тысяч хатніх гаспадарак вызначана для атрымання безнаяўных жыллёвых субсідый

**Пра гэта паведаміў першы намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Алег ПАСКРОБКА. Новая сістэма субсідый у першую чаргу павінна была падтрымаць асоб пенсійнага ўзросту і сацыяльна неабароненыя катэгорыі грамадзян ва ўмовах росту ўзроўню кампенсацыі насельніцтвам затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслуг. Тут выкарыстоўваюцца два прынцыпы — выяўляльны і заяўны. Па першым — пенсіянерам з малой пенсіяй і інвалідам субсідыя даецца аўтаматычна. Астатнім прэтэндэнтам на такую падтрымку неабходна пісаць заяву і збіраць адпаведныя дакументы.**

Сёння сістэма ўжо пачала працаваць, але яе першыя вынікі крыху здзіўляюць нават кіраўніцтва ЖКГ. Работнікі міністэрства падлічылі, што хатніх гаспадарак, якія патэнцыйна маглі б трапіць пад атрыманне жыллёвых субсідый па выяўляльным прынцыпе, каля 420 тысяч. А на самай справе субсідыі атрымалі толькі прыкладна 2 тысячы сем'яў. Астатнія маюць большыя даходы, чым прапісана ў дакуменце, таму ў гэтую катэгорыю слабаабароненых і не трапляюць.

«Праграма новая, мы яе тэстуем. Сёння спецыялісты правяраюць кожны рахунак-паведамленне. Але парадак лічбаў, на жаль, атрымаўся невялікі, — сказаў Алег Паскробка. — Мы разумеем, што ў выпадку змены тарыфаў, дапамогай у выглядзе безнаяўных жыллёвых субсідый скарыстаецца значна большая колькасць людзей».

СТАР. 4

■ Прыёмная кампанія — 2016

## У ПАГОНІ ЗА «БРЭНДАМІ»

### «Эканоміка» і «Камерцыйная дзейнасць» здаюць пазіцыі?

**«Міністэрства адукацыі зацікаўлена ў тым, каб як мага хутчэй былі зацверджаны новыя Правілы прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы — гэта дазволіць пазбегнуць сацыяльнага напружання, звязанага з падрыхтоўкай да ўступнай кампаніі 2017 года», — падкрэсліў у сваім выступленні на калегіі міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.**

СТАР. 4



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ЁСЦЬ РЭЗЕРВЫ

## Сітуацыю ў сферы машынабудавання неабходна кардынальна выпраўляць

**Аб гэтым Прэзідэнт заявіў, заслухаўшы даклад аб стратэгіі развіцця беларускага машынабудавання.**

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што на нарадзе летам 2015 года было даручана выпрацаваць меры па развіцці машынабудаўнічых арганізацый краіны. Больш за год урад вызначаўся са стратэгіяй развіцця машынабудавання, спад у гэтай галіне зацягнуўся. Пры тым, што вядучым арганізацыям галіны была аказана значная дзяржпадтрымка, істотных станоўчых вынікаў не відаць, сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Толькі за 2014—2015 гады прадпрыемствы страцілі палову аб'ёму выпускаемай прадукцыі, у тым ліку амаль 25% за 2015 год. Пры нізкай базе мінулага года прамысловы патэнцыял галіны за студзень—кастрычнік 2016 года прырос усяго на 3%. «Калі мы і далей будзем развіваць вытворчасць у такім рэжыме і тэмпах, то для выхаду на ўзровень 2013 года спатрэбіцца, як вы разумееце, дзясяткі гадоў. Такія тэмпы недапушчальныя. Сітуацыю трэба кардынальным чынам выпраўляць», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Хацеў бы ад сённяшняй нарады атрымаць сумленную, адкрытую і прынцыповую размову: што перашкаджае, што трэба зрабіць і як мы гэта будзем рабіць», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка змяніў фармат правядзення нарады, праграма якой прадугледжвала даклады на розныя тэмы, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Замест гэтага ён адрасаваў канкрэтныя пытанні міністрам, губернатарам, дырэктарам, дэталёва цікавіўся станам спраў на найбуйнейшых прадпрыемствах краіны. У цэнтры ўвагі былі вытворчыя планы, пытанні вяртання дэбіторскай запазычанасці, экспарту, складскіх запасаў.

Міністр прамысловасці Віталь Воўк далажыў аб рабоце прадпрыемстваў айчыннага машынабудавання, перспектывах і стратэгіі яго развіцця з улікам сусветных тэндэнцый. Ён пазначыў як аб'ектыўныя, так і суб'ектыўныя прычыны праблем у галіне. У цэлым ёсць стратэгія развіцця машынабудавання Беларусі да 2020 года і бачанне перспектыў да 2030 года. Кіраўніку дзяржавы даложана аб фінансава-крэдытнай падтрымцы прадпрыемстваў, рабоце на рынках краін-партнёраў, дыверсіфікацыі экспартных паставак.

Аляксандр Лукашэнка заявіў пра неабходнасць больш актыўнай работы па дыверсіфікацыі рынкаў збыту, у тым ліку па лініі знешнепалітычнага ведамства. Ён даручыў прааналізаваць працу прадстаўніцтваў беларускіх кампаній за мяжой і іх кадравы склад.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу на важнасць узгодненай вытворчай палітыкі ўнутры краіны, каб не ствараць на розных прадпрыемствах дублюючыя вытворчасці. Асаблівы акцэнт зроблены і на тэме якасці выпрацаванай прадукцыі. Патрабаванне кіраўніка дзяржавы — яшчэ раз прааналізаваць і ўсталяваць жорсткі кантроль у гэтым пытанні на ўсіх этапах.

Разам з прынцыпам тых ці іншых рашэнняў у вытворчай сферы, рэфармаваннем або структурнай перабудовай на прадпрыемствах, кіраўнік дзяржавы патрабуе ад кіраўнікоў не забываць аб сацыяльных абавязках, неабходнасці павелічэння даходаў работнікаў. Натуральна, усё гэта павінна адбывацца ва ўвязцы з ростам прадукцыйнасці працы, павышэннем эфектыўнасці вытворчасцяў.

Дзяржава, у сваю чаргу, гатова пры неабходнасці падставіць прадпрыемствам плячо. Напрыклад, у частцы папаўнення абаротных сродкаў. Галоўная ўмова — наяўнасць канкрэтных заказаў на прадукцыю і выгадныя праекты. Аляксандр Лукашэнка адзначыў гатоўнасць на сваім узроўні вырашаць стратэгічныя пытанні развіцця галіны, прымаць неабходныя рашэнні. Адначасова ён падкрэсліў, што ў першую чаргу дырэктары і кіраўнікі ведамстваў павінны вырашаць праблемы, якія ляжаць у сферы іх кампетэнцыі. «Я б не цісну і не настойваў, калі б мы гэтага не маглі зрабіць. Але я бачу велізарныя рэзервы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«У краіне няма чырвоных дырэктараў і алігархаў. Усе павінны напружвацца і даваць вынік. Вы не мне гэтыя вынікі даяце. Гэта ваш гонар, вашы прадпрыемствы. І вы, калі ласка, варушыцеся. Упэўнены, што ў гэтай сітуацыі можна нармальна працаваць», — сказаў ён.

На заканчэнне Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што вынікі работы службовых асоб у гэтым годзе будуць старанна прааналізаваны. Гэта тычыцца не толькі прамысловасці, але і сельскай гаспадаркі, сферы ЖКГ і іншых.

# За плённую працу

**Дзяржаўных узнагарод удастоены больш за 190 работнікаў розных сфер дзейнасці. Адпаведны Указ падпісаў Прэзідэнт.**

Яны ўзнагароджаны за шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў, мужнасць і адвагу, праяўленыя пры выратаванні людзей, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў у прамысловасці і будаўніцтве, сельскай і лясной гаспадарцы, значны асабісты ўклад у развіццё галіны навуковых даследаванняў, энергетычнай сістэмы, сферы адукацыі, аховы здароўя, бытавога абслугоўвання насельніцтва, мастацтва, культуры і спорту.

Сярод узнагароджаных — памочнік Прэзідэнта Беларусі Мікалай Корбут і старшыня СВК «Агракамбінат Сноў» Мікалай Радаман. Яны ўдастоены ордэна Айчыны III ступені. Генеральны дырэктар ААТ «Барысаўскі завод аўтатрактарнага электраабсталявання» — кіруючая кампанія холдынга «Аўтакампаненты» Анатоль Капскі, рэктар Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта Вітольд Песціс адзначаны ордэнам Пашаны.

За заслугі ў розных сферах дзейнасці вялікая група работнікаў адзначана медалямі за выратаванне жыццё, за адзнаку ў воінскай службе, у ахове Дзяржаўнай мяжы, у папярэджанні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый, за працоўныя заслугі і медалём Францыска Скарыны.


**ЗАСО «Промтрансинвест»**

**предлагает принять участие в процедуре закупки № 2016-394496, размещенной на сайте http://www.icetrade.by, по изготовлению бланков «Страховой сертификат. Обязательное страхование гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории государств – членов системы «Зеленая карта»**

(договор страхования «Зеленая карта», тираж – 92 000 шт., тел. (17) 222 75 39.

УНП 100357923


## ■ Экспарт

# ІНДУСЫ ВЫБІРАЮЦЬ... БЕЛАРУСКАЕ

### Нашы кампаніі ўдзельнічаюць у найбуйнейшай выставе рэгіёна

**Больш за 50 айчынных кампаній прадстаўлены на 36-й Індыйскай міжнароднай выставе-кірмашы ў Нью-Дэлі.**

Пяты Усебеларускі народны сход пастанавіў: адным з прыярытэтаў для развіцця нашай краіны ў цяперашнюю пяцігодку з'яўляецца экспарт. Удзел у індыйскай выставе дае магчымасць шэрагу нашых прадпрыемстваў заявіць пра сябе на рынку Паўднёвай Азіі яшчэ раз.

India International Trade Fair (IITF) — найбуйнейшая выстава ў Індыі, якая штогод збірае тысячы экспанентаў і больш за мільён наведвальнікаў. Гэта маштабная пляцоўка дасягненняў індыйскай эканомікі: свае павільёны прадстаўляюць розныя рэгіёны, найбуйнейшыя карпарацыі, дзяржаўныя органы. На выставе арганізуюцца нацыянальныя павільёны больш чым трыццаці краін свету. Традыцыйна яе адкрывае Прэзідэнт Індыі Пранаб Мукерджы. Асноўнай заяўленай тэмай IITF — 2016 з'яўляюцца лічбавыя тэхналогіі, на развіццё гэтага сектара эканомікі ўрад краіны ўскладае асаблівыя надзеі.

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе выставачнага прадпрыемства «Белінтэрэкспа» Беларускай гандлёва-прамысловай палаты, нашым экспазіцыям надаецца вялікая ўвага падчас асвятлення мерапрыемства ў індыйскіх СМІ, а таксама падчас рэкламнай кампаніі. Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Індыя Віталь Прыма быў запрошаны да ўдзелу ў галоўнай цырымоніі адкрыцця выставы.

Падчас выставы адбылося пасяджэнне Беларуска-Індыйскага Дзелавога савета, арганізаванага Беларускай гандлёва-прамысловай палатай і Федэрацыяй гандлёва-прамысловых палат Індыі пры падтрымцы Пасольства Беларусі ў Індыі.

Асаблівай цікавасцю на індыйскай выставе карыстаецца стэнд Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь, дзе прадстаўлены больш за 120 навукова-тэхнічных распрацовак. Многія з іх не маюць аналагаў у свеце.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## ■ Перспектыва

# Больш рабочых месцаў

### Прамзона «Ікітэлі» (Турцыя) вывучае магчымасць стаць рэзідэнтам СЭЗ «Гроднаінвест»

**Адна з вядучых турэцкіх прамысловых зон разглядае варыянт размяшчэння вытворчасці ў Лідзе, Смаргоні ці Гродне. Рэзідэнцтва ў свабоднай эканамічнай зоне дае кампаніі магчымасць карыстацца льготным падатковым і мытным рэжымам.**

«Інвестыцыі важныя для ўсіх тэрыторый. Яны даюць комплекснае развіццё рэгіёна, — адзначае **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Віктар АМБРАЖЭЙЧЫК**. — Перш за ўсё, гэта стварэнне працоўных месцаў на пабудаванай вытворчасці і выпуск новай прадукцыі. Людзі імкнуцца ў мегаполісы — і гэта праблема для некаторых рэгіёнаў, таму галоўнае — забяспечыць іх работай. А за гэтым пойдзе і развіццё інфраструктуры, бо трэба будаваць жыллё. Можна прасачыць і такі ланцужок: у кватэру спатрэбіцца мэбля, значыць гэта адаб'ецца на дрэваапрацоўцы, што дасць, у сваю чаргу, эфект для лесанарыхтоўчай прамысловасці. Ідзе развіццё рэгіёна, таму ў прыцягненні інвестыцый зацікаўлены ўсе».

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

## ■ Падтрымка маладых

# ГРАНТЫ ДЛЯ АДОРАНЫХ

**Кожны трэці праект, які фінансуецца Беларускім рэспубліканскім фондам фундаментальных даследаванняў, — маладзёжны. Пра гэта падчас брыфінгу на сайце Нацыянальнага прэс-цэнтра расказаў дырэктар выканаўчай дырэкцыі БРФФД Сяргей ГАПОНЕНКА. Паводле яго слоў, штогод абвяшчаюцца конкурсы, скіраваныя менавіта на падтрымку маладых навукоўцаў, 30—40 працэнтаў заявак зацвярджаюць і спансіруюць пры дапамозе грантаў.**

— У нашым партфелі цяпер каля 600 праектаў, якія знаходзяцца на стадыі экспертызы, — расказаў навуковец. — Штогод мы разглядаем некалькі соцень заявак і прысуджаем некалькі соцень грантаў. Пераважная большасць з іх — міжнародныя. Фонд з'яўляецца галоўным інструментам для рэалізацыі міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы навукі, мы маем пагадненні прыкладна з 20-цю аналагічнымі фондамі з самых розных краін. Сярод іх навуковыя ўстановы Украіны, Малдовы, Кыргызстана, Азербайджана, Арменіі.

Нядаўна навуковы савет БРФФД выдзеліў 40 грантаў на рэалізацыю шэрагу праектаў. Сярод іх сумесная распрацоўка ў галіне новых матэрыялаў з Паўднёвай Карэяй, работа па стварэнні лазераў, якія генерыруюць вельмі кароткія імпульсы святу, з В'етнамам, даследаванне назапашвання трансуранавых элементаў у грыбах і вывучэнне біяхімічных працэсаў у клетках пухлін з Украінай.

Але найбольш актыўна міжнароднае супрацоўніцтва традыцыйна развіваецца з Расіяй. З 1997 года наладжана сумесная работа з Расійскім фондам фундаментальных даследаванняў і Расійскім гуманітарным фондам. Акрамя гэтага, беларусы вядуць сумесныя распрацоўкі ў Аб'яднаным інстытуце ядзерных даследаванняў у Дубне. Цяпер з расійскімі навукоўцамі рэалізуецца каля дзвюх соцень праектаў. Разам з Інстытутам вірусалогіі Расійскай акадэміі медыцынскіх навук нашы навукоўцы вывучаюць вірус імунадэфіцыту чалавека, які цыркулюе на тэрыторыі дзвюх краін. Прадстаўлена і гуманітарная сфера: гэта такія даследаванні, як «Беларуская дыяспара ў Сібіры і Карэліі», «Археалагічныя помнікі беларуска-расійскага памежжа» і іншыя. Ёсць праекты ў сферах эканомікі, дэмаграфіі, інфарматыкі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

## ■ Сталічны час

# ДАРОГІ РАМАНТУЮЦЬ ШКЛОВАЛАКНОМ, А ЛІШНІ СНЕГ АДПРАЎЛЯЮЦЬ У «ПЕЧ»

### Сучасныя тэхналогіі на службе гарадской гаспадаркі

**Адна з найбольш вострых праблем усіх буйных гарадоў — дарогі, прычым не толькі інтэнсіўны трафік, але і іх утрыманне. Пра стан вулічна-дарожнай сеткі, а таксама яе гатоўнасць да зімовага перыяду расказаў намеснік генеральнага дырэктара аб'яднання «Гарамаўтадар Мінгарвыканкама» па бягучым утрыманні Анатоль ЖАМОДЗІК.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У гэтым годзе ў сталіцы ўпершыню была прыменена тэхналогія рамонту дарожнага палатна з дапамогай шкловалакна. Новая распрацоўка — вынік сумесных намаганняў прадстаўнікоў «Гаррамаўтадора», БНТУ і кітайскіх спецыялістаў. Пры рамонце дарог цяпер наносяцца дадатковыя ахоўныя пласты са шкловалакна, што дазваляе падоўжыць тэрмін эксплуатацыі асфальтабетонных пакрыццяў і павялічыць прамежак паміж рамонтамі на 3-5 гадоў. Пры гэтым тэхналогія досыць бюджэтная, выпрабаванне яна прайшла паспяхова, таму будзе прымяняцца і ў наступным сезоне.

Такім чынам было адрамантавана 155 тыс. кв.м дарожнага палатна. Новае пакрыццё зроблена на вуліцах Свіслацкай (ад МКАД да вуліцы Машынабудаўнікоў), Машынабудаўнікоў (ад Галадзеда да Свіслацкай), Бачылы (ад МКАД да Свіслацкай), Цімашэнкі (ад Прытыцкага да Панамарэнкі), праспекце Пушкіна (ад Прытыцкага да Альшэўскага). Усяго ж ў 2016 годзе палепшана якасць 730 тыс. кв.м вулічна-дарожнай сеткі сталіцы, з іх цалкам замянілі практычна 50%.

Яшчэ адна навінка гэтага года ў рабоце «Гаррамаўтадора» — увядзенне ў эксплуатацыю першага снегаплавільнага пункта. Ён знаходзіцца ў раёне перасячэння вуліцы Машынабудаўнікоў і МКАД. Пры дапамозе «гіганцкай печы» можна утылізаваць 5 тыс. куб. метраў снегу ў суткі. Плануецца, што туды яго будуць вазіць з бліжэйшых раёнаў. Акрамя таго, у сталіцы падрыхтавана 18 пляцовак для складзіравання снегу, якія былі адобраны экалагамі.

— Да зімовага перыяду ў нас цалкам гатовы 727 адзінак спецтэхнікі. У рэзерве ёсць яшчэ 250 — 300, якія гатовы прадставіць іншыя арганізацыі, — усе дзеянні узгоднены з планам «Завея». Нарыхтавана неабходная колькасць процігалалёднай і пясчана-салянай сумесі — каля 56 тыс. тон. На дадзены момант для нас гэта аптымальна па суадносінах кошт—якасць рэагент, — адзначыў Анатоль Жамодзік.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

## ■ За кадрам

# ЗАБЫТЫ ГЕРОЙ

**Учора ў шырокі пракат выйшла кінастужка «28 панфілаўцаў». А ўжо сёння гэты фільм пра подзвіг пакажуць у кінатэатры ва Уздзе.**

Перад сеансам прадстаўнікі раённай арганізацыі Беларускага саюза афіцэраў раскажуць мясцовым жыхарам аб іх земляку — Паўлу Гундзіловічу, ураджэнцу вёскі Ліцвяны, чый подзвіг быў незаслужана забыты.

Наш зямляк камандаваў той самай 4-й ротай 1075-га стралковага палка 316-й стралковай дывізіі, якая 16 лістапада 1941 года ў раёне раз'езда Дубасекава спыніла наступленне 50 нямецкіх танкаў. Праўда, у ліку тых 28 герояў імя нашага земляка не значыцца. А між іншым, Павел Гундзіловіч камандаваў ротай у 140 чалавек. Менавіта яго байцы, абараняючы Маскву, утрымлівалі пазіцыі на Валакаламскім напрамку паўтара месяца. Загінулі амаль усе.

Ёсць інфармацыя, што менавіта Павел Гундзіловіч упершыню агучыў імёны 28 панфілаўцаў — тых, каго ўспомніў. Сярод іх былі забітыя і зніклыя без вестак. Можна сказаць, што менавіта наш зямляк паспрыяў таму, што гэтыя людзі атрымалі найвышэйшыя ўзнагароды. А сам ён адзначаны нічым не быў.

У тым баі яму пашчасціла — ён выжыў. Але варожая куля дагнала яго ў 1942 годзе.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■

## ■ Ініцыятыва

# Паэзія без межаў

### Носьбіты розных моў чытаюць верш Багдановіча

Адбываецца гэта ў межах адмысловага праекта «Чытаем Багдановіча на мовах народаў свету», зладжанага Выдавецкім домам «Звязда» пры падтрымцы Літаратурнага музея класіка і сталічнай бібліятэкі №8, якая носіць яго імя. Выдатны верш Максіма «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...» у перакладзе на розныя мовы чытаюць іх носьбіты. Відэа можна пабачыць на сайце zviazda.by.

Тэорыя паэтычнага перакладу сцвярджае: перастораны на іншай мове, верш мусіць захоўваць не толькі сэнс і рыфму, але і рытм, мелодыку гучання. Гэта амаль магія — агучаны на незнаёмай мове, твор можа падацца родным і блізкім. Менавіта такое чараўніцтва адбываецца, калі чуеш твор Максіма Багдановіча на кітайскай, харвацкай, карацінскай і многіх іншых мовах.

Праект, зладжаны да 125-годдзя класіка, якое мы адсвяткуем 9 снежня, яшчэ раз даказвае — сапраўдная паэзія не мае межаў, прыгажосць слова паэта выразна адчуваецца на розных мовах, а мелодыка, закладзеная ў яго аўтарам, зачароўвае і прымушае думаць. Верш «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...» напісаны ў часы, калі ішла Першая сусветная вайна, заклікае да ўзаемаразумення, міру. Сапраўды, перафразаваўшы знакамітыя словы паэта, навошта сварыцца, калі мы ўсе разам ляцім да зор?

Магчыма, з гэтай прычыны, зразумеўшы пастулат Максіма, на прапанову арганізатараў праекта «Чытаем Багдановіча на мовах народаў свету» так ахвотна адгукнуліся прадстаўнікі іншых народаў і культур, якія жывуць у Беларусі, а таксама носьбіты моў з усяго свету.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

■

## ПРАМАЯ ЛІНІЯ

# ПАЧУЦЬ І ДАПАМАГЧЫ

У гэтую суботу, **26 лістапада**, адбудзецца сумесная прамая тэлефонная лінія **кіраўніка адміністрацыі Фрунзенскага раёна г. Мінска Арцёма ЦУРАНА і рэдакцыі газеты «Звязда»**. Нагадваем, што нумар (8 017) 204 31 26 працуе з 9.00 да 12.00.

Таксама **26 лістапада** адбудзецца прамая тэлефонная лінія **кіраўніка спраў Гарадоцкага райвыканкама Ірыны ДЗЯМ'ЯНЕНКІ і рэдакцыі газеты «Звязда»**. Тэлефануйце з 9.00 да 12.00 па тэлефоне (8 02139) 41 4 45.

Пра тое, якія пытанні ўзнімаюць жыхары Фрунзенскага раёна сталіцы і Гарадоччыны, а таксама, як улады знаходзяць спосабы іх вырашэння, можна даведацца са старонак нашага выдання.

«Звязда» заўсёды імкнецца асвятляць самыя актуальныя і важныя тэмы, якія сапраўды закранаюць нашых чытачоў. Прамыя лініі з кіраўнікамі мясцовай улады — эфектыўны спосаб быць пачутым, таму практыку сумеснай работы мы плануем развіваць і далей.

## ■ Надвор'е

# Моцны вецер і галалёдзіца на дарогах

### На наступным тыдні сіноптыкі абяцаюць пахаладанне і ўтварэнне снежнага покрыва

**Зімовы характар надвор'я чакаецца ў Беларусі ў апошнія дні лістапада, паведамляе галоўны сіноптык Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

У пятніцу ў асобных раёнах пройдуць невялікія ападкі — дождж і мокры снег, туман, магчымы слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра складзе ад нуля да плюс 5 градусаў. Сырое і ветранае надвор'е чакаецца ў нас і ў суботу. Пераважна ў паўночнай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі (мокры снег і дождж), чакаецца слабы галалёд, уначы і раніцай на дарогах галалёдзіца. Удзень у паўночных і цэнтральных раёнах прагназуецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 5 марозу на ўсходзе да 2 цяпла на захадзе краіны, удзень — ад мінус 1 градуса да плюс 5.

У нядзелю на тэрыторыі краіны будуць гаспадарыць франтальныя раздзелы, звязаныя з цыклонам, які змяшчаецца з Ленінградскай вобласці на Верхнюю Волгу. Надвор'е яшчэ пагоршыцца. Амаль паўсюдна будуць ісці мокры снег і дождж. Чакаецца слабы галалёд, уначы і раніцай на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла, удзень будзе ад мінус 1 да плюс 5 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў, на наступным тыдні да нас ізноў завітае зіма, утворыцца снежнае покрыва і пахаладае. У панядзелак чакаецца паступленне халодных паветраных мас з поўначы Еўропы. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег, слабая мяцеліца. Раніцай і ўдзень у асобных раёнах чакаецца моцны парывісты вецер. На асобных участках дарог — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 1 — мінус 6 градусаў, удзень —ад мінус 4 градусаў да 1 цяпла. Холадна і ветрана будзе і ў аўторак. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да 3—9 марозу, удзень — ад мінус 5 градусаў да плюс 1.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

# Буквар узростам 385 гадоў і не толькі

### У глыбінцы ўсё больш людзей цікавяцца гісторыяй і краязнаўствам

**У Віцебскай абласной бібліятэцы імя У. І. Леніна адбылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 385-годдзю выхаду ў свет «Буквара» Спірыдона Собаля. Больш за 50 навукоўцаў, музейных работнікаў, даследчыкаў з Беларусі, Латвіі і Расіі прынялі ў ёй удзел. Разам з бібліятэкай у якасці арганізатараў канферэнцыі выступілі Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава і абласны краязнаўчы музей. Па выніках навуковай сустрэчы плануецца выданне другога тома краязнаўчага штогодніка «Віцебскі край», які быў заснаваны сёлета.**

Спірыдон Собаль нарадзіўся ў сям'і магілёўскага бурмістра і сваю першую адукацыю атрымаў у Магілёве. У 1630 годзе ён заснаваў пры Куцеінскай лаўры пад Оршай друкарню, якая ў XVII стагоддзі стала цэнтрам беларускага кірылічнага кнігадрукавання. Собаль ведаў некалькі моў. Дзякуючы яму выйшлі ў свет каля 20 выданняў. Імем Спірыдона Собаля ў Магілёве названая абласная ўзбуйненая друкарня, а ў Оршы — вуліца.


БУКВАРЪ
Сиречь,
НАЧАЛО УЧЕНІА
Детемъ начинающимъ чтенію изыкати.
в Кутейнѣ
Изображеніе.
в Тѵпографіи
СПИРИДОНА
СОБОЛА.
Року, ҂АХЛА.

**Тытульная старонка «Буквара» Спірыдона Собаля, 1631 год, Куцеінская друкарня.**

У бібліятэцы сёлета праходзіць шмат мерапрыемстваў для аматараў гісторыі. У прыватнасці, пасля заканчэння канферэнцыі, прысвечанай «Буквару» 1631 года, зацікаўленыя праслухалі лекцыю «Традыцыі гарадскога самакіравання ў Віцебску». Гэта частка праекта «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада». На мінулых лекцыях гісторыкі, аматары даўніны распавядалі пра паселішчы на месцы будучага горада. Гаварылі і пра ролю княгіні Вольгі ў яго старадаўняй гісторыі, ролю скандынаваў у развіцці гандлёвых шляхоў, гарадоў і княстваў на Русі. Вялікую цікавасць выклікала і тэма рэлігійнага жыцця, гарадскога побыту ў X—XIII стагоддзях.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*


## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества, расположенного по адресу: г. Гродно, ул. Суворова, 127
## 13 декабря 2016 года

| Вид аукциона открытый | Лот № 1 | Лот № 2 |
|---|---|---|
| Предмет аукциона | Комплекс зданий, изолированных помещений, сооружений и оборудования, включающий 11 капитальных строений (производственные корпуса, административно-бытовой корпус, бетонно-смесительный узел, мотовозное депо, складские помещения, открытый склад готовой продукции, железнодорожный путь № 3, благоустройство территории), водопроводную сеть чугунную, электрическую сеть 0,4 кВ, эстакаду для разгрузки и погрузки ж/б изделий, дом-вагончик, токарный станок 16К20, кран-балка 1Б-5, П/Я-128/1, установку для нагрева воды «Эффект», кран мостовой Т-40, кран мостовой КМ-10 | Складские помещения общей площадью 11,1 м² и общей площадью 145,6 м² |
| Начальная цена продажи | **3 348 242,4 рубля** (с учетом НДС 20%) | **31 680 рублей** (с учетом НДС 20%) |
| Кадастровые номера земельных участков и размеры | 440100000002006703 площадью 1,2520 га, 440100000002006703 площадью 1,2520 га, 440100000002006706, площадью 0,0133 га, 440100000002006704 площадью 0,8189 га, 440100000002006705, площадью 0,0251 га, 440100000002006709 площадью 0,0360 га, 440100000002006710 площадью 0,0146 га, 440100000002006714 площадью 0,1545 га, 440100000002006712 площадью 0,3151 га, 440100000002006715 площадью 0,0642 га, 440100000002006711, площадью 0,1863 га, 440100000002006713 площадью 0,3361 га, 440100000002006707 площадью 0,7542 га, 440100000002006708 площадью 0,1046 га, 440100000001006541 площадью 0,0069 га | 440100000001006542 площадью 0,0034 га и 440100000001006543 площадью 0,0234 га |
| Месторасположение земельных участков | **г. Гродно, ул. Суворова, 127** | |
| Продавец | **Ликвидационная комиссия КУП «Гродненский завод СЖБ-10»** | |
| Имущественное право земельных участков | Право постоянного пользования | |
| Сумма задатка | 600 000 рублей | 6 000 рублей |
| Организатор аукциона | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел.: 720537, 720546 | |
| Дата проведения аукциона | **13 декабря 2016 года** | |
| Время проведения аукциона | 12.00 | |
| Место проведения аукциона | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал | |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 57 | |
| Дата и время начала приема документов | 28 ноября 2016 года 8.00 | |
| Дата и время окончания приема документов | 9 декабря 2016 года 17.00 | |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале №400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», код 752, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости». **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**


# ПУЦЁЎКА Ў ЧЭХІЮ

### Жаночая баскетбольная зборная прабілася на чэмпіянат Еўропы

**Беларускія дзяўчаты атрымалі права ўдзельнічаць у фінальнай частцы кантынентальнага першынства, нягледзячы на тое, што не занялі першае месца ў сваёй адборачнай групе G. На вышэйшым радку размясціліся бельгійкі, якім нядаўна беларускі прайгралі ў адборы — 61:67.**




Згодна з рэгламентам ЕўраБаскету ў фінальную частку праходзяць каманды, якія занялі першыя месцы і лепшыя шэсць дружын, якія занялі другія радкі ў групах. Менавіта ў лік апошніх і трапілі падапечныя новага трэнера зборнай Наталлі Трафімавай. У заключным матчы адборачнага турніру ў нашай групе зборная Бельгіі разграміла каманду Польшчы — 77:61 і фінішавала першай. Наша зборная заняла другі радок, а зборная Польшчы стала трэцяй.

Такім чынам, пропуск у фінальную частку чэмпіянату Еўропы атрымалі: Славенія, Францыя, Італія, Украіна, Венгрыя, Расія, Бельгія, Турцыя, Іспанія, Беларусь, Латвія, Грэцыя, Сербія, Славакія, Чарнагорыя і гаспадыня турніру — Чэхія.

Кантынентальны турнір пройдзе з 16 па 27 чэрвеня 2017 года ў Празе і Градзец-Кралаве. Жараб'ёўка адбудзецца 9 снежня.

Нагадаем, што нашы баскетбалісткі дэбютавалі на чэмпіянаце Еўропы ў 2007 годзе ў Італіі. Там дзяўчаты паказалі свой лепшы вынік, узяўшы бронзавыя медалі чэмпіянату. У складзе каманды тады былі цяперашні трэнер зборнай Наталля Трафімава, а таксама Алена Леўчанка, Таццяна Троіна, Наталля Марчанка, Анастасія Верамеенка і іншыя. Яшчэ двойчы беларускі фінішавалі чацвёртымі ў 2009 і 2015 гадах, былі пятымі ў 2013-м і дзявятымі ў 2011-м.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

# У ПАГОНІ ЗА «БРЭНДАМІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ** дадаў, што Міністэрствам адукацыі быў падрыхтаваны праект Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб змяненнях і дапаўненнях у Правілы прыёму асоб для атрымання сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі першай ступені. Работа над дакументам вялася на падставе даручэнняў кіраўніка дзяржавы і прапаноў дзяржаўнай камісіі, ён быў разгледжаны Саветамі дырэктараў ССНУ і рэктараў ВНУ, абмеркаваны і ўзгоднены з усімі заснавальнікамі ўстаноў сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, іншымі зацікаўленымі дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі. Палажэнні праекта ўказа двойчы атрымалі вуснае адабрэнне кіраўніка дзяржавы на сустрэчах з міністрам адукацыі. Але працэдура яго ўзгаднення і зацвярджэння зацягваецца... Між іншым, патэнцыяльныя абітурыенты ўжо распачалі сваю падрыхтоўку да паступлення. Навучэнцы выпускных профільных педагагічных класаў таксама чакаюць абяцаных ім прывілеяў. Таму адкладваць далей вырашэнне гэтага пытання немагчыма.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Удасканаленне ЦТ

Вадзім Богуш спыніўся на самых важных момантах прыёмнай кампаніі 2016 года і зробленых з яе высновах.

З 1 чэрвеня па 19 жніўня ў Міністэрстве адукацыі працавала «гарачая лінія» для абітурыентаў, на якую паступіла каля 1200 званкоў. Найбольш часта грамадзян цікавілі пытанні атрымання адукацыі ў завочнай форме непрацуючымі асобамі, умовы атрымання другой вышэйшай адукацыі, працэдура падачы дакументаў у прыёмныя камісіі даверанымі асобамі абітурыентаў і некаторыя іншыя.

— Лічу, што прыёмным камісіям устаноў адукацыі трэба больш якасна праводзіць сярод абітурыентаў і іх бацькоў тлумачальную работу аб правілах прыёму, максімальна дакладна і поўна даваць адказы на ўсе пытанні, — лічыць Вадзім Богуш. — Акрамя таго, звяртаем увагу кіраўнікоў устаноў адукацыі на актуальнасць пастаяннай работы з членамі прыёмных камісій у плане іх інфармавання і навучання — як па пытаннях валодання нарматыўнай базай, так і па пытаннях камунікатыўнай этыкі.

У цэнтралізаваным тэсціраванні ўдзельнічалі сёлета больш як 98 тысяч абітурыентаў. Па 15 вучэбных прадметах было здадзена каля 260 тысяч тэстаў. Абсалютны вынік (100 балаў) удзельнікі тэсціравання паказалі ў 330 выпадках. Пятнаццаць абітурыентаў атрымалі 100 балаў па двух вучэбных прадметах (у 2015 годзе — адзінаццаць). І тры абітурыенты прадэманстравалі максімальны вынік па трох вучэбных прадметах (у 2015 годзе такіх бліскучых вынікаў не было).

Цэнтралізаванае тэсціраванне, як лічыць Вадзім Богуш, зарэкамендавала сябе як аб'ектыўны інструмент правядзення ўступных выпрабаванняў, але і ён падвяргаецца штогадоваму ўдасканаленню. Спецыялістамі Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў была павялічана ўдзельная вага задач практыка-арыентаванай накіраванасці, мадэрнізавана канструкцыя заданняў.

У цяперашні час Міністэрствам адукацыі разглядаюцца розныя варыянты ўдасканалення як зместу тэстаў, так і метадычных падыходаў да іх фарміравання і апрацоўкі, у тым ліку з выкарыстаннем перадавога міжнароднага вопыту. «Адназначна такі аналіз будзе праводзіцца з прыцягненнем вучоных-экспертаў, — паабяцаў Вадзім Богуш. — Гэту работу плануецца завяршыць да 2021 года».

На наступны год дзеючая методыка разліку тэставага бала ўдзельнікаў ЦТ захаваецца, як захаваюцца і падыходы да вызначэння «парогавых» балаў па прадметах уступных выпрабаванняў у дадатковы набор.

## Пакуты выбару

Як жа размяркоўваліся ў гэтым годзе патокі выпускнікоў? Базавую школу скончылі 89,9 тысячы чалавек, што практычна адпавядае выпуску 2015 года (89,7 тыс. чалавек). Па прагнозах, у 2017 годзе выпуск дзевяцікласнікаў паменшыцца больш чым на 3 тысячы чалавек, або на 3,4 працэнта. 18,7 працэнта выпускнікоў базавай школы абралі месцам далейшага навучання ўстановы прафтэхадукацыі. 14,3 працэнта дзевяцікласнікаў паступілі ва ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Астатнія ж навучэнцы (65 працэнтаў) працягнулі навучанне на старшай ступені школы.

11 класаў скончылі 56,1 тысячы чалавек (у 2015 годзе — 55,9 тысячы чалавек). Выпуск адзінаццацікласнікаў у 2017 годзе складзе, па прагнозах, 57,5 тысячы чалавек, што на 2,3 працэнта больш, чым у 2016 годзе.

16 працэнтаў адзінаццацікласнікаў залічана на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі, 20 працэнтаў — на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі і 56,3 працэнта — на ўзровень вышэйшай адукацыі.

Найбольш запатрабаванымі спецыяльнасцямі ў абітурыентаў, якія паступалі на дзённую бюджэтную форму ў ВНУ, сталі «Міжнародныя адносіны» (прахадны бал склаў 382), «Міжнароднае права» (382), «Сучасныя замежныя мовы (пераклад): кітайская і другая замежная мова» (377), «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» (374), «Судовая экспертыза» (372), «Стаматалогія» (368 балаў). А найменш зацікавілі моладзь «Заатэхнія» (прахадны бал 85), «Абсталяванне і тэхналогія зварачнай вытворчасці» (116), «Тэхналогія машынабудавання» (118), «Тэхналагічная эксплуатацыя беспілотных авіяцыйных комплексаў» (119) і «Металургічная вытворчасць і матэрыялаапрацоўка» (125 балаў).

— Варта адзначыць, што высокія прахадныя балы часта звязаныя з мінімальнай колькасцю выдзеленых бюджэтных месцаў па спецыяльнасці, што пацвярджае нізкі заказ на згаданыя кадры. Але масавае імкненне за «брэндавымі» назвамі спецыяльнасцяў перашкаджае абітурыенту старанна вывучыць асаблівасці будучай прафесіі, убачыць вузкую скіраванасць кваліфікацыі, разгледзець аналагічныя напрамкі падрыхтоўкі, якія маюць больш шырокі спектр прафесійных кампетэнцый, — адзначае Вадзім Богуш. — Часам самі ўстановы адукацыі спрабуюць адкрыць падрыхтоўку па спецыяльнасцях з прывабнымі назвамі замест таго, каб павысіць якасць прафарыентацыйнай і тлумачальнай работы, актывізаваць дзейнасць па ўзаемадзеянні з заказчыкамі кадраў.

## Запасны шанц

На ўмовах мэтавай падрыхтоўкі ў ВНУ было прынята 2193 чалавекі, што складае 87,6 працэнта ад плана. Цалкам выканалі пакацчыкі прыёму на мэтавыя месцы ВНУ міністэрстваў аховы здароўя, культуры і МНС.

Вадзім Богуш канстатуе, што праблема прыцягнення абітурыентаў на мэтавыя месцы па-ранейшаму застаецца вострай:

— Перавагі мэтавай падрыхтоўкі відавочныя (студэнтам-мэтавікам гарантуецца праходжанне практыкі, арганізацыя вытворчага навучання, працаўладкаванне, замацаванне на першым працоўным месцы), але абітурыенты не імкнуцца да заключэння дагавораў аб мэтавай падрыхтоўцы, а арганізацыі-заказчыкі кадраў не прадугледжваюць для іх дадатковых прэферэнцый. Заключэнне дагавораў аб мэтавай падрыхтоўцы ажыццяўляецца штогод, як правіла, да 1 мая. Патрабаванняў да ўзроўню ведаў абітурыента ні Правіламі прыёму, ні дагаворамі не прадугледжана. У гэты час яшчэ немагчыма вызначыць — «слабы» ці добра падрыхтаваны абітурыент будзе ўдзельнічаць у конкурсе на мэтавае месца.

**Дзеючая методыка разліку тэставага бала ўдзельнікаў ЦТ захаваецца, як захаваюцца і падыходы да вызначэння «парогавых» балаў па прадметах уступных выпрабаванняў у дадатковы набор.**

Вопыт сведчыць, што частка абітурыентаў, якія заключылі дагавор аб мэтавай падрыхтоўцы, не прыходзяць потым у прыёмныя камісіі. Прадбачачы такую сітуацыю, арганізацыі-заказчыкі кадраў павінны заключаць дагаворы аб мэтавай падрыхтоўцы на адно і тое ж мэтавае месца з некалькімі абітурыентамі, ствараючы перадумовы для конкурсу і разлічваючы на паступленне больш падрыхтаванага абітурыента.

Вадзім Богуш звярнуў увагу, што па выніках уступнай кампаніі 2016 года дзяржаўная камісія прапанавала ўвесці норму, згодна з якой пры конкурсе адзін чалавек на мэтавае месца — гэтыя месцы перадаюцца на агульны конкурс. Прапанова будзе ў найбліжэйшы час вынесена для абмеркавання з усімі зацікаўленымі.

## У чаканні чацвёртага тэста

На ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі сёлета засталіся незапоўненымі 670 месцаў, сярэдняй спецыяльнай адукацыі — 145 і вышэйшай адукацыі — 18. Ужо традыцыйна (не першы год) застаюцца незапоўненымі месцы на спецыяльнасцях лёгкай прамысловасці. Прычым па ўсіх узроўнях адукацыі...

— Відавочна, што намаганняў адных толькі ўстаноў адукацыі і заснавальнікаў у гэтым кірунку недастаткова. Трэба радыкальна памяняць ролю працадаўцаў, галіновых органаў кіравання, аб'яднанняў наймальнікаў у гэтым пытанні, — упэўнены Вадзім Богуш. — Недаборы могуць быць выключаны пры ўзважаным падыходзе да фарміравання кантрольных лічбаў прыёму, высокаэфектыўнай прафарыентацыйнай рабоце і пастаянным кантролі з боку кіраўніцтва ўстановы адукацыі за арганізацыяй уступнай кампаніі. **У поўнай ступені рызыка ўзнікнення недабору ў ВНУ будзе зніжана за кошт чацвёртага тэста** (такая магчымасць прадугледжваецца ў праекце новай рэдакцыі Правілаў) — гэта дасць магчымасць абітурыентам павысіць варыятыўнасць выбару пры паступленні на родасныя спецыяльнасці.

Што тычыцца вакантных месцаў на платнай аснове, то тут сітуацыя ў значнай ступені залежыць ад сацыяльнага запыту на тую ці іншую спецыяльнасць, якія вельмі цяжка спрагназаваць. Так, у 2016 годзе вакантныя платныя месцы засталіся на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі на спецыяльнасцях «Бухгалтарскі ўлік, аналіз і кантроль», «Эканоміка і арганізацыя вытворчасці», «Камерцыйная дзейнасць», «Страхавая справа», «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва», якія яшчэ пару гадоў таму былі папулярныя сярод абітурыентаў.

А на ўзроўні вышэйшай адукацыі знізіліся прахадныя балы па эканамічных і будаўнічых спецыяльнасцях прасочваецца ўжо і на бюджэце. Так, у 2016 годзе прахадны бал на спецыяльнасці «Эканоміка» ў БДЭУ быў 261, а ў 2015 годзе — 341. Па спецыяльнасці «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва» ў БНТУ прахадны бал быў сёлета 194, а ў 2015 годзе — 261.

Усяго на ўзровень вышэйшай адукацыі на платнай аснове ў дзяржаўныя і прыватныя ўстановы адукацыі было прынята 29,1 тысячы чалавек. Незапоўненымі ў дзяржаўных ВНУ на платнай аснове засталіся 444 месцы на дзённай форме навучання, 992 месцы — на завочнай форме і 26 месцаў — на вячэрняй.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# НАВАЎВЯДЗЕННЕ НА ПЕРСПЕКТЫВУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Падлічылі спецыялісты і тых, хто вырашыў атрымаць субсідыю самастойна. Аказалася, што гэты прынцып цяпер увогуле амаль не працуе. З заявамі на налічэнне безнаяўных жыллёвых субсідый звярнуліся 315 хатніх гаспадарак. Па іх прынята 164 рашэнні: 63 заяўнікі атрымалі субсідыі, а 101-му адмовілі. Гэта пры тым, што ў сістэме ЖКГ зарэгістравана каля 3 мільёнаў 542 тысяч асабовых рахункаў хатніх гаспадарак.

«Аналіз адмоў паказвае, што і тут парогавае значэнне, у межах якога прадастаўляюцца безнаяўныя жыллёвыя субсідыі, не дасягнута. Астатнія заявы знаходзяцца на стадыі разгляду», — адзначыў Алег Паскробка.

Прынцыповым момантам для атрымання такой субсідыі з'яўляецца мінімальная мяжа сярэднямесячнага даходу сям'і, які будзе параўноўвацца з сумай аплаты за жыллёва-камунальныя паслугі. На практыцы падобную дапамогу будуць прадастаўляць у выпадку, калі штомесячная плата за «камуналку» ў межах устаноўленых нормаў спажывання гэтых паслуг перавышае 20% сярэднямесячнага сукупнага даходу сям'і, якая пражывае ў горадзе, і 15% — у сельскім населеным пункце.

Дарэчы, гэтыя працэнты могуць і змяніць. У Міністэрстве ЖКГ цяпер ідуць размовы аб тым, каб прапанаваць дыферэнцыраваны парог атрымання субсідыі. Напрыклад, тыя, хто мае зарплату ў 300 рублёў, будуць мець парог у 5% ад даходу замест 20%, а тыя, у каго 400 рублёў — 10%.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Здарэнні

# НАЕХАЎ НА ДАРОЖНІКАЎ

**У выніку аварыі на сталічным праспекце Незалежнасці загінуў дарожны рабочы, паведамілі ў прэс-службе МНС.**

Удзельнікамі начнога дарожна-транспартнага здарэння сталі адразу тры аўтамабілі. Цягач DAF сутыкнуўся з грузавым аўтамабілем МАЗ, апошні з-за гэтага прасунуўся наперад і ўдарыўся ў машыну для дарожнага рамонту. У выніку рабочы, 1970 года нараджэння, атрымаў несумяшчальныя з жыццём траўмы, яшчэ адзін дарожнік, 1974 года нараджэння, быў шпіталізаваны з папярэднім дыягназам «чэрапна-мазгавая траўма сярэдняй ступені цяжкасці».

На месца аварыі выехалі ратавальнікі, якія дэблакіравалі кіроўцу аўтамабіля прыкрыцця. Яго таксама даставілі ў бальніцу з чэрапна-мазгавой траўмай і пашкоджаннямі. Верагоднай прычынай ДТЗ называюць стан здароўя кіроўцы фуры — мужчына адчуў сябе дрэнна за рулём. У яго дыягнаставалі шырокі інфаркт і даставілі ў бальніцу.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■ Май на ўвазе!

# СВЯТЫ БЕЗ ПАЖАРАЎ

**Зусім хутка ў краіне пачнецца пераднавагодняя мітусня. На кірмашах ужо з'явіліся ў продажы разнастайныя піратэхнічныя вырабы. Дамы і офісы ўпрыгожаць елкі. А для ратавальнікаў гэты час стане яшчэ больш напружаным.**

— Акцыя «Бяспечны Новы год» будзе праходзіць з 5 па 30 снежня, — кажа **першы намеснік начальніка ўпраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Уладзімір СУВОРАЎ.** — У дамах адпачынку, школах і іншых грамадскіх месцах мы праверым, ці падыходзяць памяшканні для масавага святкавання. Прыйдзем і ў працоўныя калектывы, дзе раскажам пра сакрэты абыходжання з грымучымі забаўкамі. Гандлярам трэба рыхтавацца да рэйдаў, падчас якіх будзе правярацца, ці адпавядае рэалізуемая імі піратэхніка патрабаванням тэхнікі бяспекі.

На наступным тыдні да нас зноў завітае зіма. У халады людзі больш часу праводзяць у памяшканнях, інтэнсіўней карыстаюцца печкамі і электрапрыборамі. Узрастае ў гэты перыяд і колькасць пажараў, якія ўзніклі з-за непатушанай нецвярозым чалавекам цыгарэты...

— Доля такіх пажараў можа дасягаць трох чвэрцяў ад агульнай колькасці, — працягвае Уладзімір Сувораў. — Рэзкі скачок адбываецца ў навагоднія і калядныя святы. І што адметна, 90% усіх пажараў магло б не быць пры выкананні элементарных правілаў бяспекі.

Разам з тым у Беларусі прасочваецца ўстойлівы трэнд на паніжэнне колькасці ўзгаранняў і гібелі на іх людзей. Напрыклад, у параўнанні з мінулым годам падзенне склала 9 і 4,8 працэнта адпаведна. Але ратавальнікі зазначаюць: без масіраванай прафілактычнай работы такіх вынікаў дасягнуць не атрымалася б.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

■ За кадрам

# ГАВОРЫЦЬ І ПАКАЗВАЕ «ЧАСІНКА»

## Карэспандэнт «Звязды» пабывала на здымачнай пляцоўцы папулярнага тэлепраекта

**На гэтым тыдні Беларускае тэлебачанне адзначае адразу дзве знакавыя даты: Сусветны дзень тэлебачання, які ўвайшоў у гісторыю 10 гадоў таму, а таксама — вось супадзенне! — 10 гадоў з першага эфіру адной з самых запатрабаваных праграм канала «Беларусь 1» — «Беларускай часінкі». І няхай стаж праграмы адносна сціплы, але яе значнасць цяжка пераацаніць. Па прыблізных падліках, у эфір выйшла больш за 2000 выпускаў, у кожным з якіх карэспандэнты і вядучыя з дапамогай экспертаў аказвалі рэальную дапамогу людзям, якія сутыкнуліся са складанымі жыццёвымі сітуацыямі.**

*«Беларуская часінка» — ліцэнзійны тэлепрадукт, інфармацыйна-аналітычная праграма, створаная ў фармаце «народных навінаў» па ўзоры і падабенстве папулярнай праграмы «Времечко», якая некалі выходзіла на Расійскім тэлебачанні. Маскоўскі «прашчур» даўно сышоў з эфіру, а беларускі аналаг, хоць і перажыў няпростыя часы, але не закрыўся, набыў уласны твар і заваяваў давер аўдыторыі — нездарма яго называюць «самым народным» тэлепраектам.*

*За 10 гадоў праграму вялі ў тым ці іншым складзе 10 прафесійных вядучых: Саша Снегіна, Міхаіл Кірычэнка, Вольга Шлягер, Сяргей Прохараў, Канстанцін Юманаў, Юлія Заўгародняя, Генадзь Давыдзька, Алег Ціткоў, Алена Спірыдовіч, Уладзімір Богдан.*

*Штотыдзень каманда тэлепраекта атрымлівае дзясяткі лістоў, SMS-паведамленняў, званкоў, допісаў на афіцыйным сайце Белтэлерадыёкампаніі і на старонках у сацыяльных сетках са скаргамі, зваротамі па кансультацыю, просьбамі дапамагчы разабрацца ў тым ці іншым набалелым пытанні. Спажывецкі панядзелак, камунальны аўторак, юрыдычная серада і рознапланавы чацвер — пастаянныя гледачы ўжо добра ведаюць, якой тэме прысвечаны чарговы выпуск. А вось як менавіта праграма робіцца, ведаюць нямногія. Карэспандэнт «Звязды» паглядзела прамы эфір «Беларускай часінкі» з рэжысёрскай студыі і даведалася, ці часта маўчыць эфірны тэлефон, што адбываецца падчас рэкламы і да чаго так і не змаглі прызвычаіцца тэлевядучыя.*



### Калі побыт заядае

15 хвілін да эфіру. У вялікай «шасцісотай» студыі Белтэлерадыёкампаніі ўжо ўсе на месцы: вядучыя сённяшняга выпуску Алена Спірыдовіч, Уладзімір Богдан і Сяргей Прохараў завяршаюць тракт — генеральную рэпетыцыю эфіру, аператары і тэхнікі настройваюць святло і камеры, а нябачны рэжысёр камандуе працэсам. Сёння на парадку дня — вечныя пытанні, хто вінаваты і што рабіць... з камунальнымі праблемамі.

***— ЖКГ — такая самая актуальная тэма зваротаў, як і шмат гадоў таму?*** — цікаўлюся ў шэф-рэдактара «Беларускай часінкі» **Святланы Грынчык.**

— Прынамсі, адна з самых набалелых. У «камунальных аўторках» нам вельмі дапамагае кіраўнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і СМІ Міністэрства ЖКГ Генадзь Аксіловіч, які дзяжурыць на «гарачай лініі» і аператыўна тлумачыць незразумелыя моманты, і ўсё адно пытанняў на гэту тэму менш не становіцца. Але далёка не толькі ЖКГ хвалюе гледачоў. Тэмы зваротаў абумоўленыя рэаліямі жыцця: увялі ў Беларусі мацярынскі капітал — пачалі цікавіцца гэтай тэмай, абвясцілі пра жыллёвыя субсідыі — пытаюцца пра ўмовы іх атрымання. З'явілася ў праграме спажывецкая рубрыка — стала больш пытанняў з гэтай сферы. Але найбольш, напэўна, зваротаў да юрыстаў — у эфіры некалькі гадоў «вядзе прыём» адвакат Галіна Камароўская, а на сайце праграмы гледачоў кансультуе адвакат Максім Церашкоў.

— Хвіліна да эфіру! — папярэджвае рэжысёр, і ўсе пабочныя размовы сціхаюць. Над пультам адлічвае апошнія секунды гадзіннік — і пасля ўступных цітраў Сяргей Прохараў агучвае некаторыя тэмы і сюжэты сённяшняга выпуску.

**...Хто ў адказе за сапсаваныя дамафоны, як знайсці гаспадароў пустуючай кватэры, якая замінае капрамонту, і ў якія дзверы грукаць, калі ва ўласных пакоях няма чым дыхаць з-за суседскіх «умельцаў»? Гэтыя відэасюжэты, а таксама нязменная за 10 гадоў рубрыка, прысвечаная дапамозе цяжкахворым дзецям, — загадзя вядомы вядучым «касцяк» праграмы, а якія сюрпрызы прынясуць званкі і SMS-паведамленні, не можа сказаць ніхто.**

«Вядучыя, якія прымаюць званкі, з першых слоў ацэньваюць, ці зможа чалавек за 1-2 хвіліны сцісла і зразумела выкласці свой зварот — калі так, то пускаюць званок у эфір, калі не — з ім дасканала разбіраюцца карэспандэнты, гатовыя выехаць у кожны рэгіён», — тлумачыць шэф-рэдактар «Беларускай часінкі».

Дарэчы, пацвярджаю: тэлефоны ў студыі практычна не змаўкаюць, пакуль у эфіры транслюецца відэасюжэт, вядучыя і эксперт ледзь паспяваюць адказваць на званкі.

### Паспець усё

У перапынках, калі ідуць рэкламныя блокі, вядучыя дазваляюць сабе крыху расслабіцца (прамы эфір — тое яшчэ выпрабаванне для нерваў!) і нават пажартаваць. Але рэжысёр няўмольна нагадвае: праз некалькі секунд трэба вяртацца ў эфір. Вядучыя вокамгненна робяцца засяроджана-дзелавымі і ні на секунду не губляюць сутнасці абмеркавання. Бабруйск, Брэст, Гомель, Мінск, Слуцк, Клецк, Магілёў — пытанні пра розныя аспекты камунальнай гаспадаркі гарохам сыплюцца з усіх куткоў краіны.

Генадзь Аксіловіч, які дзяжурыць на «гарачай лініі», агучвае цікавую лічбу: безнаяўную жыллёвую субсідыю за кастрычнік атрымаюць 59 чалавек, якія аформілі неабходныя дакументы. Вядучыя ўдакладняюць, хто можа прэтэндаваць на субсідыю. Аказваецца, прыблізная формула простая: трэба сярэднюю за апошнія паўгода суму сукупнага даходу сям'і падзяліць на 5; калі лічба ў жыроўцы перавышае пятую частку (або 20%) ад вашага сямейнага даходу — маеце права звяртацца ў службу субсідавання для дэталёвых разлікаў.

Чарговая праблема — крык аб дапамозе, інакш не скажаш. З даўжэзнага факса зразумела, што нейкі час таму ў аграгарадку Прылукі Мінскага раёна памёр адзінокі чалавек. Знайшлі яго не адразу — але пахавалі, кватэру апячаталі... І цяпер суседзям нельга знаходзіцца ў пад'ездзе, бо адчыніць гэту кватэру і праветрыць ім не дазваляюць, а санітарная апрацоўка пад'езда не праводзілася. Алена Спірыдовіч звярнулася ў ЖЭУ-7 з просьбай тэрмінова прыняць меры, а прадстаўніка Міністэрства ЖКГ папрасілі ўзяць сітуацыю пад асабісты кантроль.

**...Іншым разам аднаго абмеркавання праблемы ў эфіры бывае дастаткова, каб сітуацыя змянілася ў лепшы бок. Так, днямі жанчына расказала, што заказала машыну торфу, а прывезлі палову непрыдатнага: і крышыцца, і не гарыць. Пасля ўмяшання «Беларускай часінкі» літаральна на наступны дзень жанчыне даставілі брыкеты добрай якасці.**

Але некаторыя цяжбы грамадзян з жыллёва-камунальнымі службамі могуць доўжыцца не адзін месяц і нават год, што яскрава ілюструе своеасаблівы «хіт-парад» — падборка дасланых «народнымі карэспандэнтамі» фатаграфій, якія вядучыя іранічна прадставілі як «усё цячэ, але нічога не змяняецца». Колькі часу жыхары змагаюцца з усімі гэтымі затопленымі падваламі, закінутымі свідравінамі, гнілымі трубамі — нават цяжка ўявіць.

У апошняй рэкламнай паўзе рэдактар заклапочана зазначае: «Перабіраем час, апошні сюжэт давядзецца выкідваць».

— Пуні выкідваем, — удакладняе Алена Спірыдовіч. — Давайце вырашаць, хто за кім. Можа, пачну я, потым эксперт, а трэцім будзе Сяргей.

— Трэцім я заўжды гатовы быць, — жартуе ў адказ Сяргей Прохараў. Насамрэч за гэтай пікіроўкай — задача з ювелірнай дакладнасцю разлічыць час эфіру, каб не абрываць нікога на паўслове і паспець сказаць усё неабходнае. Вопытная каманда з гэтым упэўнена спраўляецца, падсумоўвае вынікі і развітваецца з гледачамі — да наступнага эфіру.

**«Доўгажыхары» беларускага тэлеэфіру**

5. **«Зона Х» сёлета адзначыла 16-годдзе.**
4. **«Добрай раніцы, Беларусь!» у 2017 годзе споўніцца 20 гадоў.**
3. **Больш за 20 гадоў існуе ў сучасным выглядзе «Панарама».**
2. **Праграма пра армію «Арсенал» выходзіць 22 гады.**
1. **Безумоўны лідар — «Калыханка», якой сёлета споўнілася 35 гадоў.**

### Не апошняя інстанцыя

***— За гады існавання праграмы зменшылася колькасць прафесійных скаржнікаў, якія чакаюць, што вы за іх усё вырашыце?***

— Мне здаецца, толькі павялічылася, — кажа **Уладзімір Богдан.** — Я заўважыў, што з часам стаў, з аднаго боку, даволі жорсткім у некаторых пытаннях — калі ў эфір тэлефануюць людзі, якія нічога не робяць для вырашэння ўласнай праблемы, магу адказаць празмерна рэзка, а з другога боку, наадварот, празмерна добрым і інфантыльным — калі справа датычыцца дзяцей або тых людзей, якім жыццёва неабходная дапамога.

**Я тут падумаў, што «Часінка» — такі сябар і таварыш, які заўжды гатовы прыйсці на дапамогу, але ні ў якім выпадку не будзе з радасцю вырашаць праблему за вас. Пачніце гэта рабіць — а мы ўжо падхопім, параім, пракансультуем.**

Асабіста я за гэты час стаў амаль прафесійным юрыстам. І часта, калі людзі на вуліцы падыходзяць, пазнаюць і просяць нейкай парады — са здзіўленнем лаўлю сябе на тым, што ведаю адказ на іх пытанне!

— Заўжды ёсць людзі, якія жадаюць, каб нехта іншы зрабіў справу за іх, — далучаецца **Алена Спірыдовіч.** — Даходзіла да смешнага, скардзяцца: «Ваду адключылі, і халодную, і гарачую, як жыць?!» — «А ў ЖЭС тэлефанавалі?» — «Не, адразу вам!».

Што засмучае — я так і не навучылася забываць пра многія агучаныя праблемы, асабліва калі гэта цяжкая гісторыя, якая кранае душу. Аднойчы патэлефанавала жанчына: яе мужу зрабілі аперацыю на сэрцы, фактычна — паставілі новае. А тут у яго падышоў тэрмін замены пашпарта. І яна крычыць у трубку: маўляў, я не магу яго цяпер фатаграфаваць (з-за прэпаратаў ён набраў вагу, крыху «заплыў»), а мне з-за гэтага далі штраф — 4 рублі, буду скардзіцца, будзем з мужам хадзіць, дабівацца справядлівасці...

**А я слухаю і думаю: яе мужу бясплатна зрабілі новае сэрца, а жанчына, замест таго каб пырхаць вакол яго матыльком і ствараць умовы для станоўчых эмоцый, будзе цягаць яго па ЖЭСах і пашпартных сталах, уцягваць у канфліктныя сітуацыі — і дзеля чаго, дзеля адмены 4 рублёў штрафу?! Не ведаю, як змагацца з такой агрэсіўнасцю...**

— На мой погляд, часам лепш дапамагчы і надакучліваму скаржніку, і таму, хто гэтага не зусім варты, чым пераблытаць і не дапамагчы тым, хто мае ў гэтым вострую патрэбу, — заўважае **Сяргей Прохараў.** — Стараюся як мінімум выслухаць чалавека, а там арыентуюся па сітуацыі. Помню адзін званок — на шчасце, такія прыходзяць нячаста. Жанчына гнеўна патрабавала: вы тут дзецям дапамагаеце, а ў мяне нявестка нарадзіць не можа — дайце грошай на ЭКА (экстракарпаральнае апладненне)! Мне каштавала немалых высілкаў патлумачыць, што гэта далёка не пытанне жыцця і смерці.

***— Па выніках зваротаў часцей дзякуюць або зноў скардзяцца — ужо на вас?***

— Я страціў некалькі добрых знаёмых і нават сяброў з-за таго, што рызыкнуў дапамагчы, а пры разглядзе пытання выявілася, што яны ці іх сваякі не мелі рацыі. Але ўсё адно, на жаль ці на шчасце, здаровага прафесійнага цынізму я так і не выпрацаваў: не ўяўляю, як можна адмовіць на просьбу дапамагчы. І ведаеце — бывае, што мы ў студыі прагаварылі сітуацыю, прапанавалі нейкія шляхі вырашэння, а выніку ўсё адно няма — тым не менш, людзі ўдзячныя за нашу гатоўнасць выслухаць і дапамагчы. Гэта вельмі прыемна. **Яшчэ больш прыемна было б аднойчы ў чарговым выпуску раптам давядацца, што нам няма пра што казаць, — але гэта фантастыка.** Бо да той пары, пакуль некаторыя адказныя асобы і службы ставяцца да сваіх абавязкаў паблажліва, а да людзей, якіх мусяць абслугоўваць, — зняважліва, мы без працы не застанёмся.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

*tselyashuk@zviazda.by*

## Субота, 3 снежня

### Беларусь 1

**6.25** Існасць.
**6.50, 21.40 Меладрама «Каціна шчасце».**
**8.30** Буйным планам.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.50 Серыял «Сваты-3».**
**11.00** 50 рэцэптаў першага.
**12.10** Вялікі сэлфі-тур.
**12.50** Трансфармацыя.
**13.25** Гісторыі рамонту.
**14.05** Здароўе.
**15.15** Краіна.
**15.45 Меладрама «Апоўдні на прыстані».**



**19.05 Меладрама «Сэрца без замка».**
**21.00** Панарама.
**0.55** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.05** М/с «Сябры анёлаў».
**7.35** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**8.25, 23.35** Тэлебарометр.
**8.30 Серыял «Шчаслівыя разам 3».**
**10.30** Выбар гледачоў. Анімацыйны фільм «Сезон паляванне 2».
**11.55** Капейка ў капейку.
**12.35** «Нядбайнікі». Пазнавальна-забаўляльнае шоу.
**13.50** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.00** «Каханне анлайн». Рэаліці-шоу.
**16.10** «Бітва экстрасэнсаў. 13-ты сезон».
**18.20** «Вяселле ўсляпую». Рэаліці-шоу. Першы выпуск.
**19.45** «Вярніце мне прыгажосць». Медыцынскае рэаліці-шоу. Першы выпуск.
**21.10, 22.05 Фантастыка «Робат па імені Чапі».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.40 Трылер «Без кампрамісаў».**

### Беларусь 3

**7.35** «Беларуская кухня». Тушаная рыба з гароднінай.
**8.00, 13.50, 21.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20 «Аксамітавыя ручкі». Камедыя.**
**9.55** «Край».
**10.20** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**10.55** «Я хачу гэта ўбачыць!» Смілавічы.
**11.20** «Навукаманія».
**11.50** «Заапаркі свету» з Іванам Карнеевым.
**12.15** «Руская «Акула». Дак. фільм.
**13.10** «Апошні дзень». Марына Голуб.
**14.05** «Тэатр у дэталях». Спектакль Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра «Соф'я Гальшанская».
**14.25** «Подых струн».
**15.05** Анталогія «Славянскага базару». «Славянскі базар у Віцебску-2010», «Славянскі базар у Віцебску-2011».
**16.50 «Чалавек-амфібія». Меладрама.**
**18.25 «Два капітаны». Прыгоды.**
**20.00** «Франтавыя гісторыі любімых акцёраў». Анатоль Папанаў, Інакенцій Смактуноўскі.
**20.40** «Калыханка».
**21.20** «Час кіно».
**21.25 «Ноч на зямлі». Драма.**

### Беларусь 5

**7.50, 20.40** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Баскетбол. Еўраліга. «Барселона» (Іспанія) — «Панацінаікас» (Грэцыя).
**9.40** Гандбол. Кваліфікацыя да чэмпіянату свету — 2017. Жанчыны. Беларусь — Турцыя.
**11.10** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Салават Юлаеў» (Уфа).
**13.05** Слэм-данк.
**13.35** Біятлон. Этап кубка свету. Эстэрсунд. Спрынт. Жанчыны.
**14.55, 22.50** Гандбол. Кваліфікацыя да чэмпіянату свету — 2017. Жанчыны. Беларусь — Швейцарыя.
**16.35** Біятлон. Этап кубка свету. Эстэрсунд. Спрынт. Мужчыны.
**18.05** Шорт-трэк. Кубак Беларусі.
**19.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**20.10** «На шляху да ЧС — 2018». Відэачасопіс.
**20.50** Піт-стоп.
**21.20** Біятлон. Этап кубка свету. Эстэрсунд. Спрынт. Жанчыны.

### АНТ

**7.00, 8.05** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00** (з субцітрамі), **16.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.15** «Ідэальны рамонт».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.05** Тэлечасопіс «Гумарынка».
**13.20** «Удача ў прыдачу! З «Еўраопт».
**14.00, 16.20 Серыял «Прынц Сібіры».**
**16.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**17.45** «Мой бізнес».
**21.05** «Клубу Вясёлых і Знаходлівых — 55 гадоў!»
**23.15** «Усё складзецца».
**23.55** «МаксімМаксім».
**1.00** «Падмаскоўныя вечары».

### СТБ

**6.10 «Няўдачнікаў.net». Серыял.**
**7.05** «Анфас».
**7.20** Мюзікл «Чыкага».
**9.20** «Рамонт па-сумленнаму».
**10.05** «Ежа багоў».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35 «Дэмбельскі альбом». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.45, 0.45 Драма «Дазвольце ўзлёт!»**
**15.30** «Вадзіць па-руску».
**15.55** «Вялікі горад».
**16.45** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**18.35** Дак. праект: «Ежа. Тэрыторыя змовы».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 «Зграя». Серыял.**
**23.15 Камедыя «Не будзіце спячага сабаку».**

### МІР

**6.00, 2.05 Серыял «Адвакатэсы».**
**7.55** «Саюзнікі».
**8.20** М/ф.
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**9.30** «Мой лепшы сябар».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».
**10.45, 23.00 Маст. фільм «Пра беднага гусара замоўце слова».**
**13.50** «Цяжар абеду».
**14.30** М/ф «Рэальная вавёрка».
**16.15 Серыял «Неадкладная дапамога 2».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Сямейны альбом».
**7.45 Маст. фільм «Правілы жыцця».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.20 Маст. фільм «Вясёлы калейдаскоп».**
**13.00** «Наша справа».
**13.15, 14.15 Маст. фільм «Уцякаць нельга загінуць».**
**17.00** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55** «Гумар! Гумар! Гумар!»
**22.40 Маст. фільм «Па лепшае жыццё».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 8.20 Дэтэктыў «Злачынства будзе раскрыта».**
**8.00, 10.00, 14.00, 16.00** Сёння.
**8.45** «Стрынгеры НТБ».
**9.15** «Вуснамі дзіцяці».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.05** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.05** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Удача ў прыдачу!»
**14.15** «Двайныя стандарты».
**15.10** «Паедзем, паядзім!»
**16.25** «Аднойчы...»
**17.15** «Сакрэт на мільён». Роза Сябітава.
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**19.55** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.50** «Ты не паверыш!»
**21.40** «Кіно-шоу».
**23.55** «Таямнічая Расія».

### 8 канал

**9.00, 15.55, 19.15, 21.10, 23.40** «Надвор'е».
**9.05** М/ф «Дзюймовачка».
**9.30** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**9.40 Трылер «Злачынца».**
**11.25 Драма «Алоха».**
**13.15** «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф «Даліна папараці».
**14.30 «Глядзім усёй сям'ёй». Серыял «Аднойчы ў казцы».**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Айцец Браўн».**
**17.25** М/ф «Машыны казкі».
**17.45, 19.20 Серыял «Крушэнне Лаконіі», 1—2-я серыі.**
**20.50** «Вечарніца».
**21.00** «Фэшн іs my прафэшн».
**21.15 Прыгоды «Чорнае золата».**

### ВТБ

**6.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30** «Мой тата крутейшы!»
**7.30** «Ералаш».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.15** М/ф «Фіксікі».
**8.30** М/ф «Маша і мядзведзь».
**9.00** «Вялікая маленькая зорка».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** Серыял «Сям'я 3D».
**13.00** Серыял «Мамачкі».
**15.10** Драма «Залегчы на дно ў Бругге».
**17.20** М/ф «Уцёкі з планеты Зямля».
**19.10** Баявік «Нястрымныя 2».
**21.20** «Уральскія пельмені».
**23.00** Жахі «Джыперс Крыперс 2».
**4.00** «Дурні і дарогі».
**4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**5.30** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.35** «Будуецца мост». Маст. фільм.
**12.15** «Больш чым каханне». Алег Яфрэмаў і Ала Пакроўская.
**12.55** Пернікавы домік. «Драўляная скульптура».
**13.25** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**13.50** Юбілей Сяргея Дарэнскага. Настаўнік і вучні. «Урокі майстра». Дак. фільм.
**14.25** «Прырода наносіць удар у адказ». Дак. фільм.
**15.10** Аляксей Сіманаў. «Кавалачкі жыцця... Песні ваенных гадоў».
**15.25** «Анталогія савецкай песні. Ваенныя саракавыя». Дак. фільм.
**16.15** «Гульня ў бісер». «Артур Конан Дойл. «Сабака Баскервіляў».
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** XVII Міжнародны тэлевізійны конкурс юных музыкантаў «Шчаўкунок». II тур.
**19.20** «Колер часу». Ілья Рэпін.
**19.30** «Небяспечны ўзрост». Маст. фільм.
**21.00** Вялікая опера-2016.
**22.40** «Белая студыя».
**23.25** Кіно на ўсе часы. «Жанчына пад уплывам». Маст. фільм.
**1.55** Краіна птушак. «Шыкатанския вароны». Дак. фільм.
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Эліта Краіны Саветаў». Алег Анофрыеў. 2007 год.
**6.50, 9.40, 11.00, 14.50, 15.40, 17.00, 19.10, 20.35, 2.50, 3.40, 5.00, 5.35** Музычная настальгія.
**7.05** Маст. фільм «Мама выйшла замуж».
**8.30** «Ранішняя пошта». «Розныя думкі». 1986 год.
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.20** Дак. фільм «Тэатр, чужы народу».
**12.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1982. 2011 год.
**13.05** «Кінапанарама» з Э. Разанавым: «Майстры савецкага кіно». 1982 год.
**16.00** «Колба часу».
**19.05** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!» 1982 год.
**19.30** «Вясёлыя рабяты». «Прагусты не спрачаюцца». 1982 год.
**21.00** «Быў час». 2008 год.
**21.55** Маст. фільм «Прыгажун-мужчына».
**0.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казлякловай. 2005 год.
**0.50** Маст. фільм «Падкідыш».
**2.00** «Марафон-15. Старт». 1993 год.
**5.20** Дак. фільм «Мітурычы».

### EuroSport 1

**3.30 7.30, 20.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**5.00, 0.00** Снукер. UK Championship.
**6.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету.
**8.30, 22.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**9.30, 13.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
**10.30** Watts.
**10.45, 16.00** Лыжнае дваябор'е. Кубак свету.
**12.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны.
**15.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны.
**16.45** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**18.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**1.05** Зімовыя віды спорту.

### Кінакамедыя

**0.35** Меладрама «Снеданне ў ложак».
**2.10** Камедыя «Сямейка Адъ».
**3.50** Камедыя «Майскі дождж».
**5.25** Камедыя «Дарослая дачка, або Тэст на...»
**7.10** Меладрама «Выпадковы муж».
**8.50** Камедыя «Модная штучка».
**10.40** Камедыя «Палета».
**12.10** Камедыя «Дзядуля лёгкіх паводзін».
**14.00** Камедыя «Старыя разбойнікі».
**15.30** Скетчкам «Паміж намі».
**16.00** Меладрама «Сіроп».
**17.40** Камедыя «Адной левай».
**19.10** Камедыя «Гэты няёмкі момант».
**21.00** Меладрама «Вялікая Афрадзіта».
**22.40** Камедыя «Глыток».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.10** «Хронікі маскоўскага побыту».
**11.00** «Доказ віны».
**11.55, 1.45** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**14.45** «Смурфікі». Анімацыйны фільм.
**16.35** «Зоркі. Тайны. Лёсы».
**17.35** «Вакол свету. Мясціны сілы».
**18.30, 4.15** «Вулічная магія».
**19.05** «Можаце зваць мяне татам». Меладрама.
**21.10** «Код да Вінчы». Трылер.
**23.50** «Каліфрэнія». Серыял.
**0.20** «Звышнатуральнае». Серыял.
**4.40** «Усё наша жыццё — ежа». Дак. фільм.

### ТБ1000

**6.10, 18.00** Дэтэктыў «Перакладчыца».
**8.20** Камедыя «Шэф Адам Джонс».
**10.05** Драма «Жнівень».
**12.05** Фантастыка «Дывергент».
**14.25** Меладрама «Селеста і Джэсі назаўсёды».
**16.00** Баявік «У праменях славы».
**20.10** Фантастыка «Паштальён».
**23.20** Меладрама «Кіт».
**1.10** Трылер «11:14».
**2.35** Драма «Джо».
**4.30** Камедыя «Тату зноў 17».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Ключ ад спальні».
**9.10** Камедыя «Зімы не будзе».
**10.40** Драма «Кампенсацыя».
**12.15** Камедыя «Мая марачка».
**13.40** Камедыя «Па вуліцах камоду вадзілі...»
**14.55** Драма «Кіно пра Аляксеева».
**16.35** Меладрама «Домік у сэрцы».
**18.15** Меладрама «Тэрмінова выйду замуж».
**20.20** Камедыя «Практыкаванні ў выдатным».
**22.20** Меладрама «Здзіві мяне».
**0.10** Трылер «Шпіён».
**2.20** Драма «Перамір'е».
**4.35** Меладрама «Два дні».

### National Geographic

**6.00** Гульні розуму.
**6.50, 13.20, 5.15** Навуковыя недарэчнасці.
**8.05** Востраў бунтароў.
**10.20** Незвычайныя промыслы.
**11.05** Шаша праз пекла.
**11.50** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**12.35** Навука будучыні.
**14.10, 21.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**19.30** Ледзяная дарога.
**20.15** Тайны старажытнасці.
**23.20, 3.50** Апакаліпсіс Другой сусветнай.
**0.05, 4.35** Сваіх не кідаем.
**0.50** Ліхтугі за мяжой.
**1.35** Расследаванні авіякатастроф.
**2.20** Паранармальнае.
**3.05** Зона 51: сакрэтныя файлы ЦРУ.

### Discovery

**8.00** Выжыць пасля сэлфі.
**9.00** Паляўнічы на антыкварыят.
**10.00** Металамошчыкі.
**11.00** У пошуках скарбаў.
**12.00** Выжыць разам.
**13.00** Выжыванне без купюр.
**14.00, 22.00** Аляска: апошні рубеж.
**15.00** На краі Аляскі.
**16.00, 21.00** Як уладкаваны Сусвет.
**17.00** Тэхнагеніка.
**18.00, 7.10** Хуткія і гучныя.
**19.00** Свяшчэнная сталь.
**20.00** Вулічныя гонкі.
**0.00** Лавіна: трагедыя на Эверэсце.
**1.00** Землетрасенне ў Непале.
**2.00** Выжыць любой цаной.
**4.40** Аўтальнікі.

## Замор'е

## За адну бутэльку — 44 тысячы еўра!

**Жыхар нямецкага горада Кёльн зарабіў больш за 44 тысячы еўра, здаючы адну і тую ж бутэльку, паведамляе выданне Local.**

Махляр мадыфікаваў прыёмны аўтамат, які стаяў у яго краме. Ён забяспечыў яго магнітным датчыкам і своеасаблівым драўляным тунэлем, якія не давалі прыладзе здрабніць пластыкавыя бутэлькі. Гэта дазволіла здаваць адну ёмістасць шматразова, кожны раз атрымліваючы ад машыны невялікае ўзнагароджанне. Для таго каб зарабіць 44 тысячы еўра, прадпрымальнаму немцу прыйшлося больш за 177 тысяч разоў змясціць бутэльку ў аўтамат. Пасля атрымання некалькіх цэнтаў ён даставаў непашкоджаную ёмістасць і паўтараў аперацыю зноў.

У кампаніі, што ўстанаўлівае такія аўтаматы, не заўважылі падману і спраўна плацілі ашуканцу грошы. Паліцыя зацікавілася тым, што адбываецца, толькі пасля паведамлення, атрыманага ад ананімнага інфарматара. Суддзя, які разглядаў справу, выказаў здагадку, што падсудны прыйшлося пасядзець перад аўтаматам шмат дзён, манатонна выконваючы адны і тыя ж маніпуляцыі. Мужчына адказаў, што змагаўся са смуткам, слухаючы радыё. Ашуканец быў асуджаны на 10 месяцаў турмы.

## Зачалі дзіця — атрымайце бонус

**Дзесяць гатэляў у горадзе Асізі (Італія) прапанавалі бонус гасцям, якія зачалі дзіця падчас знаходжання ў іх. Некаторыя пакрыюць кошт пражывання, іншыя прапануюць адпачыць у іх яшчэ раз бясплатна, піша The Local.**

Для пацвярджэння месца зачацця спатрэбіцца толькі адзін дакумент — пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці, у якім указана адпаведная дата: дзевяць месяцаў (плюс-мінус дзесяць дзён) з часу папярэдняга прыезду ў гатэль. Паводле слоў рэгіянальнага дарадцы па турызме Эўджэнія Гуардучы, мэты ў акцыі дзве — павялічыць паток турыстаў у гістарычную частку Італіі, а таксама прыцягнуць увагу да дэмаграфічнай праблемы ў краіне.

У 2015 годзе ўзровень нараджальнасці ў Італіі стаў самым нізкім з моманту ўтварэння адзінай дзяржавы (1861 года).

## Робат упершыню напаў на чалавека

**Першы выпадак шкоды робата чалавеку зафіксаваны ў кітайскім горадзе Шэньчжэнь (Паўднёвы Кітай) на ІТ-выставе, паведаміў інфармацыйны партал «Сіна».**



На выставе некалькі сотняў кампаній прадстаўлялі розныя тавары і паслугі ў сферы высокіх тэхналогій. Уладальнікі аднаго са стэндаў прапанавалі публіцы невялікага робата, які па сваёй канструкцыі і памеры падобны да сусветна вядомага героя «Зорных войнаў» — дроіда R2-D2.

Асноўным прызначэннем «андроіда», па задумцы стваральнікаў, было навучанне дзяцей і забава наведвальнікаў. Аднак па невядомай пакуль прычыне пакінуты без нагляду робат пачаў разбураць стэнд, а калі адзін з супрацоўнікаў паспрабаваў яго спыніць, той і зусім пераехаў мужчыну нагу і прыціснуў яго. Пацярпеламу давялося выклікаць карэту хуткай дапамогі, прычым рухацца самастойна ён не змог.

Распрацоўшчыкі паводзіны свайго стварэння растлумачыць не змаглі. Інтэрнэт-карыстальнікі ж узяліся жартаваць з нагоды таго, што яны сталі сведкамі «пачатку канца чалавечай цывілізацыі».

Іван КУПАРВАС. hvir@zviazda.by




## ДЭФІЦЫТНЫЯ ЛЕКІ

У тую, дзякаваць богу, апошнюю зіму пад немцамі ў нашай вёсцы стаяў варожы гарнізон. Ён быў абнесены калючым дротам, добра ўмацаваны, пад пастаяннай вартай. І тым не менш у гэтым фашысцкім логаве мне, на той час дзесяцігадоваму хлопчыку, выпала пабываць.

...А ўсё з-за таго, што напаткала мяне досыць непрыемная хвароба — экзэма. І чаго толькі не рабілі з ёй, а пазбавіцца не маглі: даймаў надакучлівы сверб пад правым каленам.

І тады хтосьці са знаёмых параіў маме схадзіць у гарнізон да нямецкага доктара.

Помню, як мы збіраліся: мама паклала ў торбачку некалькі дзясяткаў яек, дадала да іх слоічак масла, пасля чаго, чысценька адзеўшыся, мы пайшлі па вуліцы ў бок гарнізона.

Там, на ўваходзе, нас, вядома ж, спынілі. Маме прыйшлося казаць вартавому, што яе сынок, хворы («кранк»), што нам вельмі трэба да доктара.

Як ні дзіўна, вартавы ўсё зразумеў і прапусціў нас, ды што там — нават паказаў, дзе знаходзіцца той медпункт.

Можна толькі ўявіць, з якім адчуваннем мы ішлі па гарнізоне, уваходзілі ў хату, прапахлую медыкаментамі. Але ж там, сярод чужынцаў, мама неяк адразу вызначыла, хто доктар — падышла да яго, стала расказваць пра мяне.

Не ведаю, што з яе слоў доктар разумеў, што не, але ж глядзеў — то на яе, то на мяне, слухаў, потым папрасіў раздзецца, паказаць нагу — уважліва агледзеў пляму пад каленам. А нарэшце вынес свой вердыкт: сказаў, што для лячэння маёй хваробы патрабуецца «масла слону».

— А Божухна, а дзе ж яго ўзяць?! — разгубілася матуля. — У нас жа з роду сланоў не было...

Доктар, відаць, зразумеў, што мама «ніхт фэрштэйн», пачаў гергетаць спачатку, але ж зноў упёрся ў «масла слону».

Мы з мамай хіба лыпалі вачыма, бо каровы ў вёсцы яшчэ былі, коні — таксама, але каб сланы...

Тады, ужо раззлаваўшыся, доктар узяў маміну ношку з пачастункам, дастаў з яе слоічак і сказаў:

— Масла...

...Потым паказаў на торбачку з яйкамі:

— Слону...

І нарэшце памацаў палатно.

Толькі тут мая бедная мама ўсё зразумела: больку маю трэба мазаць не чым іншым, як маслам з лёну, гэта значыць, льняным алеем!

...Вярнуўшыся дадому, мы, вядома ж, расказалі пра візіт да нямецкага медыка і разам з усімі (а нас, дзяцей, сямёра было) ад душы пасмяяліся.

Але ж галоўнае, што ў хуткім часе мама такі знайшла бутэлечку льнянога алею, мы пачалі лячэнне.

І, трэба сказаць, што яно пайшло на карысць, бо напамін пра тую даўнюю хворасць я адчуваю цяпер хіба ўвосень, з надыходам халадоў.

**Віктар Несцяровіч,**
*г. Лагойск.*

## ВОСЬ І НЕ ВЕР У ПРЫКМЕТЫ

...Тое, што куры сталі несціся значна радзей, Ганна пачала заўважаць яшчэ з Купалля. Ім то з Антосем, былым фельчарам ФАПа, яек шмат і не трэба, але ж ці не кожную суботу госці: дзеці прыязджаюць, унукі. І пачаставаць хочацца, і з сабой нешта даць...

Першай, каму Ганна сказала пра дзіўныя паводзіны курэй, была колішняя школьная сяброўка Таня. Якраз яна і ўспомніла, што яе нябожчыцасвякроў больш чым тры гады пеўня не трымала.

— А твайму дармаеду колькі?.. Шосты пайшоў?.. Дык ён і вінаваты! — прызнала сяброўка. І тут жа дадала: — Але я тваю бяду адной левай развяду! Увесну квактуху садзіла. Так што дзесяць курanят цяпер маю: трох курачак і аж сем певункоў. Любога выбірай! Я з цябе і рубля не вазьму — задарма аддам!

Нешта браць задарма, на халяву, Ганна не хацела. Дрэнная прыкмета: альбо ў сяброўкі куры звядуцца, альбо ў яе пеўнік прападзе. Але ж Таня нават слухаць не хацела пра нейкую плату...

На тым і развіталіся.

Назаўтра Ганнін Антось засек старога пеўня і з адмысловым кашом — з вечкам, у якім яго мама курaнят на продаж вазіла, — выбраўся па новага. Пашчасціла яшчэ: амаль адразу ж за вёскай яго падабрала спадарожная машына і хвілін праз дзесяць дамчала да патрэбнай брамкі.

За ёй, каля трактара, круціўся Пятрок, Танін гаспадар, якога за вочы ўсе звалі Петушком (бо змалку быў дробным, але дужа задзірыстым)...

Мужчыны павіталіся, загаманілі. На галасы тут жа выйшла Таня з кубкам ячменю. Яны разам склікалі курэй, удала злавілі патрэбнага пеўніка, і Петушок панёс яго ў кабіну трактара. Сказаў Антосю:

— Навошта ногі трапаць, доктар? Я падвязу. Справы ёсць: у ваш бок якраз еду...

І блізкая, як быццам, дарога была, але ж пакуль праехалі, Антось успомніў, што Петушка ніхто не лячыў, і, відаць, жа, не будзе, бо на сёмым годзе яго пенсіянерства на ФАП праслалі новага фельчара... А таму трэба ж чалавеку неяк аддзячыць — за пеўніка, за тое, што падвёз. Даць барыша ці што?

Параіцца не было з кім: жонка, відаць, пайшла на сяло языком памянціць. Так што самі яны, удвух, пусцілі да курэй маладога пеўніка, адамкнулі хату.

Гарэлку ад Антося гаспадыня не хавала, бо той піў рэдка і пакрысе — не столькі з-за сваёй медыцынскай адукацыі, як з-за таго, што яна, гэта адукацыя, у кожны момант магла спатрэбіцца...

Вось і зараз ён хацеў з трохлітровіка наліць гарэлкі ў бутэльку і даць Петушку з сабой (бо яно ж за рулём чалавек...). Аднак госць сказаў, што «руль нідзе не дзенецца» і што адзін ён ніколі не п'е, а таму — налівай, брат, чаркі.

Гаспадару нічога не заставалася, як плюхнуць па першай (госцю да краёў, сабе — на дно) і адразу ж па другой, бо закуска Пятра зусім не цікавіла.

А вось піток, як аказалася, ён яшчэ той! Ведама, трактарыст — чалавек у вёсцы патрэбны (можа, нават болей, чым доктар).

І, здаецца ж, не спірт напару пілі, не пяршак — звычайную самагонку, але пасля трэцяй гаспадар (з непрывычкі ці што?) захмялеў... Пасля чацвёртай ён жа стаў прафесійна разглядаць госця і думаць, як гэты здыхлік, пуды на два за яго лягчэйшы, можа столькі ў сябе ўліць?!

Пасля пятай яму ўжо цікава было паслухаць, як у Пятра зімой, сярод лесу, «паляцеў» падвесны падшыпнік...

Шостыя паўчаркі гаспадар таксама неяк пракаўтнуў, а вось сёмыя адразу ж прасіліся назад ды так настойліва, што ён ледзь выскачыў з хаты, каб разам з таварышкамі выпусціць іх на волю пад плот. (Госць у гэты час уцёк па-англійску — без падзякі.)

...Хутка вярнулася Ганька і вачам сваім не паверыла: у іхнім двары стаяў чужы трактар. У хаце за сталом, у абнімку з амаль пустым трохлітровікам, сядзеў муж, таксама быццам не яе, бо быў у дыміну п'яны...

Кінулася ў двор, каб паглядзець курэй. Яны былі, можна сказаць, не лепшыя: накульгваючы то на адну, то на другую лапу, нібы п'яныя, грэбліся ў зямлі каля плоту, дзе роўненька выцягнуўшы лапкі, ляжаў Танін маладзенькі пеўнік.

— Нежывы?.. — завохкала гаспадыня.

На голас выйшла суседка...

Гэта яна пусціла па сяле пагалоску, што доктар так напаіў певуна (ці Петушка?), што ён спруцянеў.

...Прыйшлося Тані — ужо самой — занесці сяброўцы іншага пеўніка. Як і дамаўляліся, задарма. Але Антось пра гэта даведаўся толькі пад вечар, бо зранку на ўсякі выпадак уцёк — «у грыбы».

**З. Качанкова,**
*г. Вілейка*

## ПРЫГОЖАЙ БЫЦЬ НЕ ЗАБАРОНІШ

Як казала вялікая Фаіна Ранеўская, прыгажосць — гэта страшная сіла. І дзеля яе на што толькі не ідуць жанчыны... Апошнім часам, у прыватнасці, усё больш на іх штучнага — розных там сіліконаў, парыкоў, падцяжак, накладных пазногцяў і веек, касметыкі. А сваё, што патрабуецца для «поўнага шчасця», дык гэта рост (пажадана метры пад два) і кастлявасць. Можа, ад «касцей» утварылася і слова «кастынг»?..

А некалі ж худзізна не віталася, нават наадварот — лічылася нездаровым. На сяле такіх дзевак і замуж не дужа бралі: баяліся, што не змогуць шмат працаваць, выношваць дзяцей...

Дык вось. Была ў нас адна жанчына, Нінай звалі. Целаскладам — звычайная, а вось усім іншым...

Валасы былі кучаравыя і з пазалотай, вочы — вялікія, блакітныя, а ўжо голас... Стане прыпеўкі пець, сама Мардасава пазайздросціла б! Выйдзе барыню «гуляць» — мужчыны шклянкі з гарэлкай адсунуць: сядзяць ды любуюцца!

Але ж пры ўсіх гэтых вартасцях быў у Ніны адзін недахоп. Хацелася ёй недзе прайсці і, як кажуць гумарысты, задам вільнуць, а вось яго — сапраўднага — якраз і бракавала. Прычым доўга.

Праўда, з нейкага часу бабы сталі прыкмячаць, што дзеўка, як быццам, пакруглела — у пэўным месцы. Нават дапытвацца сталі — як гэта яна ўмудрылася? Бо гэта ж цяпер па падабацца нос, рот ці нешта яшчэ — грошы заплаці і перарабілі. А тады пра гэта ніхто і не чуў...

Таямніца зусім выпадкова адкрылася, бо Нінка ж не толькі да танцаў ахвотная была, але і «да работы дурная» — ударніца яшчэ тая!

Выйшлі неяк бабы на луг, сталі сена зграбаць — спачатку ў валкі, потым валкі ў кучы... А гэта як робіцца? Чатыры-пяць кабет кладуць свае граблі зубамі ўверх і піхаюць.

Вось Нінка і ўперлася з усіх сваіх бабскіх сіл.

А нейкая вяровачка на ёй вазьмі і парвіся! А следам... падушачка з-пад спадніцы вазьмі і «выпаўзі»...

Нінка, праўда, адчула рух, тут жа падхапіла «згубу», а следам руку на паясніцу і кажа:

— Ой, бабачкі, мне так баліць спіна, так баліць, што прыходзіцца насіць падушачку — для сугрэву.

Бабы слухаюць яе і нават смяяцца не смеюць, бо хто ж яго ведае, — можа, чалавеку і сапраўды баліць? Больш спагадлівыя нават паляжаць Ніне раілі.

Але ж яна не з тых, хто спыніцца ў рабоце: зайшла за куст, прывязала свае прычындалы і зноў за граблі...

Вось бабы і дагэтуль не ведаюць, што з ёй напраўду было — балела спіна ці ўсё-такі не?

Загадка гэта... Як і сама жаночая прыгажосць.

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

■ Неасабісты суб'ектыў



# У спісах пазначаныя...

## Лік небяспечных месцаў на колішніх людскіх паселішчах ідзе на тысячы?

ПАМЯТАЕЦЕ нядаўнюю гісторыю, як паляўнічы, праваліўшыся ў закінуты калодзеж у Камянецкім раёне, праседзеў у ледзяной вадзе ледзь не цэлую ноч? У тыя вялікія лістападаўскія выхадныя надвор'е зусім «не шаптала», але ж паляўнічыя — народ упарты і заўзяты, таму не дзіва, што герой хронікі здарэнняў апынуўся там, дзе апынуўся. Цудам застаўся непакалечаным, паляцеўшы знянацку ўніз на некалькі метраў, цудам не адубеў за дзесяць гадзін...

Гісторыя гэта так і падавалася ў навінах — як гісторыя шанцавання (добра, што быў цёпла адзеты, добра, што з вады тырчэла палянка, на якую можна было абаперціся, добра, што аб гэту паляняку не ўдарыўся, калі падаў), выратавання (добра, што паведаміў родным, у які бок паедзе, добра, што жонка і дзядзька своечасова паднялі трывогу, добра, што аператыўна спрацавалі адпаведныя службы) і вернасці (калі памятаеце, там яшчэ быў сабака, які спачатку бегаў вакол, а пасля і сам скокнуў у калодзеж). Пра тое, што гэта быў няшчасны выпадак, што ён быў (выбачайце за таўталогію) зусім не выпадковым, у паведамленнях або не гаварылася зусім, або гаварылася вельмі лаканічна. Маўляў, калодзеж той, які небарака не заўважыў у высокай траве, урос у зямлю на месцы колішняга хутара. І такое пакінутае паселішча, як кажуць месцічы, у тым жа Камянецкім раёне не адзінае...

ЧАМУ я раптам гэту гісторыю, якую праз два з лішнім тыдні згадваюць, пэўна, хіба што яе непасрэдныя дзейныя асобы, успомніла? Трапіў нядаўна на вочы нарматыўны даведнік «Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь». Выданне надзвычай карыснае і патрэбнае, бо на сённяшні дзень гэта бадай што адзіная агульнадаступная і найбольш поўная крыніца назваў нашых паселішчаў. Прычым назвы гэтыя дадзены з націскамі, з правільным напісаннем на абедзвюх дзяржаўных мовах, з транслітарацыяй на лацініцы, з мясцовымі варыянтамі вымаўлення. І што асабліва цікава — у шасці тамах гэтага даведніка пазначаны назвы страчаных, якія ўжо не існуюць. Карацей, калі маеш такое жаданне, можаш знайсці фактычна поўны спіс вёсак, хутароў і нават фальваркаў, якія калісь былі і якіх ужо няма на гэтай зямлі.

Спісы гэтыя — быццам словы сумнай песні: столькі адметных прыгожых назваў у нябыццё сышло! (Нават не спрабую думаць пра тое, у колькіх людзей на гэтай зямлі фізічна, літаральна не стала малой радзімы, бацькаўшчыны — тэма асобная, шчымлівая, балючая...) Але сёння не пра гэта. Тут я проста занялася матэматыкай і страчаныя назвы ў адной толькі Брэсцкай вобласці (не самай большай па плошчы і колькасці адміністрацыйных адзінак) падлічыла. Ведаеце, колькі атрымалася? 835. Прыблізна 135 аднімем: у тым спісе — і назвы, якія трапілі пад хвалю перайменавання: паселішчы ёсць, але завуцца па-іншаму. Няхай сабе зніклых вёсак і хутароў будзе 700. І ў кожным няхай па адным калодзежы. А дадайце яшчэ склепы, многія з якіх ужо гадоў шэсцьдзясят назад былі дыхтоўнымі зацэментаванымі ямамі, куды трапіць можна было толькі спусціўшыся па лесвіцы...

ВЫ зразумелі, пра што я? Атрымліваецца, па ўсёй краіне лік небяспечных месцаў на колішніх людскіх паселішчах ідзе на тысячы. (Нават калі гаварыць пра тыя вёсачкі, якія памерлі ціхай натуральнай смерцю, злажыўшы стрэхі апусцелых хат і іншых пабудоў, бы старая бабуля — напрацаваныя рукі.) Зраўняныя з зямлёй, зарослыя высокай травой улетку, замецены снегам узімку і апалым лісцем позняй восенню і ранняй вясной, тыя закінутыя студні і склепы нябачныя, не пазначаныя ні на адной, нават самай падрабязнай схеме або карце. Дрэмлюць у зямлі мо і дзесяцігоддзямі, чакаюць свых ахвяр, якіх занясе на месца колішняга хутара вытворчая неабходнасць (у нашых мясцінах у такі закінуты калодзеж гадоў дваццаць назад напалову праваліўся трактар, што араў поле), паляўнічы імпэт, звычайная чалавечая цікаўнасць ці падлеткавая цяга да прыгод. Раней ці пазней якоесь з гэтых месцаў абавязкова дачакаецца. І скончыцца ўсё можа не так шчасліва, як для Дзмітрыя з Камянца. Зноў спішам усё на няшчасны выпадак?

ЗРАЗУМЕЛА, шукаць і засыпаць забытыя студні і сутарэнні ў чыстым полі ці на ўзлеску — справа складаная, патрабуе і грашовых выдаткаў, і прыцягнення людскіх рэсурсаў. Але мне падаецца, што гэта перш за ўсё работа для сельсаветаў і мясцовых школ, якія часам вымушаныя літаральна выдумляць «мерапрыемствы па краязнаўстве». Чаму б не зладзіць экспедыцыю па наваколлі, каб дакладна вызначыць, дзе была калісьці асобная вёска ці хутар. Для школьнікаў — цікавая і карысная прыгода, спісы лёгка знойдуцца ў тым жа сельсавеце, старыя месцічы раскажуць падрабязнасці... А гнаць пасля бульдозер на знойдзенае месца і нават шукаць патэнцыяльную небяспеку зусім неабавязкова. Проста неяк абазначыць яго: у той жа школьнай майстэрні зрабіць прыгожую шыльду, напісаць: «На гэтым месцы калісьці была вёска... (Белае Возера, напрыклад, як у Лунінецкім раёне, ці хутар Межыгор, як у Маларыцкім)». Асобна можна дадаць штосьці накшталт: «Будзьце асцярожныя, тут маглі застацца рэшткі гаспадарчых пабудоў...» І прымацаваць гэту шыльду да дрэва, да вялікага каменя, да адмыслова ўбітага слупка. Глядзіш, выпадковы мінак спыніцца, прачытае, памаўчыць, падумае. Пра тое, што трэба быць асцярожным. Ці пра тое, што трэба як мінімум з павагай ставіцца да месца, дзе калісьці нараджаліся і паміралі, весяліліся і гаравалі, спявалі і працавалі гэткія самыя людзі...

Захаваць чалавечае здароўе, жыццё і Памяць — ці ёсць справа больш высакародная?

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by* ■

**ООО «Центр Белинвентаризация»**
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**

- Раздел и установление порядка пользования земельным участком
- Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
- Пересчет долей в связи с изменением капитального строения
- Оценка всех видов собственности

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БОБРУЙСКТРАНС»

| № лота | Наименование и характеристики объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение (административное) с инв. №710/D-81581, площадью 111,9 кв.м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Гоголя, 181/7-1** | **52 300,00 руб.** (523 000 000 бел. руб. – в денежных знаках образца 2000 г.) | **5 230,00 руб.** (52 300 000 бел. руб. – в денежных знаках образца 2000 г.) |

| | |
|---|---|
| **Информация о земельном участке** | Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 741000000007002243 площадью 2,6457 га. Выделение земельного участка будет осуществляться после приобретения объекта с торгов согласно законодательству Республики Беларусь |
| **Срок подачи заявления** | **По 05 декабря 2016 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **06 декабря 2016 г. в 12.00** по адресу: г. Бобруйск, ул. Минская, 123 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012178339010 в Региональной Дирекции №300 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 491323266<br>Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация»,<br>Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 25.11.2016 г. |
| **Условия продажи** | Имущество продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 5%. Заключить договор купли-продажи в течение 20-ти рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость имущества согласно договору купли-продажи.<br>Указанный объект находится под арестом. Стоимость лота без учета НДС (20%), сформированная на аукционе при продаже, должна быть перечислена на ОАО «Бобруйсктранс», а сумма НДС (20%) от цены лота, сформированной на аукционе при продаже, должна быть перечислена на ГУ МФ РБ по Могилевской области за ОАО «Бобруйсктранс». Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Подробная информация в газете «Звязда» от 06.09.2016 г., на сайте www.bti-gomel.by и по тел.: 8(029) 341 15 45 и 8(0232) 75 06 62**

---

БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «АСБ Беларусбанк»**
**информирует вкладчиков о переводе вкладов (депозитов) с незначительными остатками на отдельный счет банка**

Перевод вкладов (депозитов) с незначительными остатками на отдельный счет осуществляется ежегодно не позднее предпоследнего банковского дня января.

Перевод вкладов (депозитов) на отдельный счет осуществляется:

- в случае отсутствия операций (кроме зачисления дохода, начисленного на остатки средств на счете) в течение предыдущего года и до даты перевода (более 12 месяцев, не включая срока наложения ареста или приостановления операций);

- если остаток вклада (депозита) по состоянию на 1 января текущего года с учетом годовой капитализации составляет:

- по вкладам в белорусских рублях – от 0 до 1 (99 копеек включительно) белорусского рубля;

- по вкладам в иностранной валюте – от 0 до 5 (4.99 включительно) единиц номинала валюты вклада.

Дополнительным условием перевода вкладов (депозитов) с незначительными остатками на отдельный счет банка по срочным вкладам (депозитам) является истечение срока возврата вклада (депозита); по условным вкладам (депозитам) – наступление (ненаступление) определенного в договоре обстоятельства (события).

Причитающиеся вклады (депозиты) и доходы по ним выплачиваются вкладчикам при их явке в подразделения банка, отделения РУПС.

**Контакт-центр – 147**
**www.belarusbank.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

---

## Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в дер. Глинище, дер. Белая Лужа и дер. Перемежное Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1. | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2. | **Дата, время и место проведения аукциона** | **26 декабря 2016 года, в 15.00**<br>г. Жодино, пер. Молодежный, 3<br>Жодинский сельисполком, кабинет №1 |
| 3. | **Продавец и его адрес** | Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3 |
| 4. | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | **Лот № 1** – земельный участок площадью 0,1305 га с кадастровым номером 624881704101000050 в деревне Глинище, участок № 2.<br>**Лот № 2** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881701601000120 в деревне Белая Лужа, ул. Магистральная.<br>**Лот № 3** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881711101000063 в деревне Перемежное |
| 5. | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6. | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7. | **Начальная цена продажи** | **Лот № 1** – 5 000 рублей<br>**Лот № 2** – 4 000 рублей<br>**Лот № 3** – 8 000 рублей |
| 8. | **Условия проведения аукциона** | Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.<br>Аукцион считается состоявшимся при наличии не менее двух участников |
| 9. | **Наличие инженерной инфраструктуры** | **Лоты № 1, № 3 (возможность электроснабжения, газоснабжения).**<br>**Лот № 2 (возможность электроснабжения)** |
| 10. | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной цены земельного участка, р/с 3641000000263 в филиале №616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25«А», код 812, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион») |
| 11. | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками** | Каждую среду в 15.00 |
| 12. | **Окончательный срок приема заявлений** | **20 декабря 2016 года до 17.00** |
| 13. | **Контактные телефоны** | 8-01775 35-449, 8-01775 37-174, 8-01775 37-189 |

Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя, или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

---

ОАО «КАТЭК» (г. Минск, ул. Инженерная, д. 22, оф. 304) информирует, что внеочередным общим собранием акционеров **принято решение о реорганизации ОАО «КАТЭК» в форме преобразования в ЗАО «КАТЭК»** (протокол № 08/11/16 от 08.11.2016 г.).

УНП 808001233

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** **г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29** |

**Предмет аукциона**

**Лот №1. Гараж**, общ. пл. 20,3 кв.м, в т.ч. погреб и смотровая яма, инв. № 700/С-90093, адрес: Могилевская обл., **г. Могилев**, р-н пр. Шмидта – ул. Габровской, блок 13, гараж 5. Начальная цена с НДС 20% – **4 367,30 BYN** (43 673 000 BYR)

**Лот №2. Гараж**, общ. пл. 20,1 кв.м, в т.ч. погреб и смотровая яма, инв. № 700/С-90094, адрес: Могилевская обл., **г. Могилев**, р-н пр. Шмидта – ул. Габровской, блок 13, гараж 6. Начальная цена с НДС 20% – **4 367,30 BYN** (43 673 000 BYR)

**Лот №3. Гараж**, общ. пл. 19,7, в т.ч. погреб и смотровая яма, инв. № 700/С-90095, адрес: Могилевская обл., **г. Могилев**, р-н пр. Шмидта – ул. Габровской, блок 13, гараж 18. Начальная цена с НДС 20% – **4 609,93 BYN** (46 099 300 BYR)

**Лот №4. Гараж**, общ. пл. 18,7 кв.м, в т.ч. погреб и смотровая яма, инв. № 700/С-90096, адрес: Могилевская обл., **г. Могилев**, р-н ГСК з-да «Техноприбор», блок 18, гараж 968. Начальная цена с НДС 20% – **3 882,05 BYN** (38 820 500 BYR)

**Лот №5. Гараж**, общ. пл. 18,7 кв.м, в т.ч. погреб и смотровая яма, инв. № 700/С-90097, адрес: Могилевская обл., **г. Могилев**, р-н ГСК з-да «Техноприбор», блок 18, гараж 969. Начальная цена с НДС 20% – **3 882,05 BYN** (38 820 500 BYR)

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012743260072; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012743260098; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, производит оплату приобретаемого объекта недвижимого имущества следующим образом:

**Вариант 1:**
100% от стоимости реализации объекта недвижимого имущества оплачиваются в течение 15 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи. Передача объекта недвижимого имущества покупателю производится в течение 5 рабочих дней с момента полной оплаты его стоимости.

**Вариант 2:**
В течение 15 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи покупатель обязан оплатить 20% от стоимости реализации объекта недвижимого имущества.
Оставшаяся часть оплачивается ежемесячно в течение 12 месяцев с момента заключения договора купли-продажи равными долями с уплатой процентов за пользование рассрочкой в размере 0,5 ставки рефинансирования Национального Банка Республики Беларусь. При этом покупатель обязан в течение 15 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи предоставить банковскую гарантию об уплате гарантом в пользу ОАО «Белинвестбанк» оставшейся суммы денежных средств, включая НДС и проценты за пользование денежными средствами в случае нарушения покупателем обязательств по оплате объекта недвижимого имущества в соответствии с заключенным договором купли-продажи.
Передача объекта недвижимого имущества производится в течение 5 рабочих дней с момента оплаты 20% его стоимости и предоставления покупателем банковской гарантии (при этом передаваемый объект недвижимого имущества не признается находящимся в залоге у ОАО «Белинвестбанк»)

С 10 октября по 31 декабря 2016 года ОАО «Белинвестбанк» проводит акцию по кредитованию юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на приобретение имущества, реализуемого ОАО «Белинвестбанк».
Целевое назначение: - в текущую деятельность; - на финансирование инвестиций.
Форма выдачи: - разовый кредит; - невозобновляемая кредитная линия; - возобновляемая кредитная линия.
Срок кредитования: - до 84 месяцев при финансировании инвестиций; - до 36 месяцев при кредитовании в текущую деятельность. Валюта кредита: BYN. Сумма кредита: без ограничения. Процентная ставка: от 14,9% годовых

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 02.09.2016 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **14.12.2016 в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 29А** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **13.12.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

---

**Управляющий по делу о банкротстве ООО «ИсузуТрак» ЧСУП «Корпорация Антикризисного Управления»**

**проводит торги в форме открытого аукциона, который состоится 27 декабря 2016 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Есенина, д. 30, к. 7, следующего имущества:**

**Лот №1 – ХОЛОДИЛЬНО-ОТОПИТЕЛЬНОЙ УСТАНОВКИ Thermo King V300 Max 30 Spectrum, начальная цена лота – 8 555,29 рубля, в т.ч.: НДС – 20%;**

**Лот № 2 – G-IDSS ДИАГНОСТИЧЕСКОЕ ОБОРУДОВАНИЕ, начальная цена лота – 2 181,36 рубля, в т.ч.: НДС – 20%.**

*Задаток в размере 10% от начальной цены каждого лота перечисляется до подачи заявления на участие в торгах в срок по 26.12.2016 включительно на р/с 3012100021662 в ЗАО «РРБ-Банк», код 110 РБ, получатель – ООО «ИсузуТрак», УНП 192204989.*

